ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 57 (4309)
ПЯТНІЦА, 11 сакавіка 1933 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: Перадавы — У найкарацейшы тэрмін завяршыць ільназагатоўкі. А. Захарава. — За савецкую культурную ашчадкасу (3-я стар.). А. Дабравольскі. — Хімічная прамысловасьць БССР у другой пяцігодцы (2-ая стар.). Разам з масамі змагацца за насеньне — Да 15-ай гадавіны лютаўскай рэвалюцыі (1-ая стар.). Г. Таў — Рост узбраеньняў і падрыхтоўка антысавецкай вайны. Партыйна-масавую работу ў цэлу, у брыгадзе штодзенна спалучаць з задачамі барацьбы за высокія колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну. Старт усебеларускастдан (2-ая стар.).

Правільна арганізаванай працай у спалучэньні з перадавой агратэхнікай, наступаць на ўсіх вучастках барацьбы за ўраджай. Дрыбінскі раён выканаў штурмавое заданьне (месячнік дарожнага будаўніцтва) (3-я стар.).

Японцы ліхаманкава рыхтуюцца да новага наступленьня. Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4-я стар.).

У найкарацейшы тэрмін завяршыць ільназагатоўкі

Мы стаім перад фактам невыкананьня пляну загатовак ільнавалакна па БССР у вызначаны тэрмін і недапушчальнага аслабленьня тэмпаў работы за апошнія дні.

Да 1 сакавіка з поўнай перамогай прышлі толькі чатыры раёны (Лоеўскі, Крычаўскі, Любаньскі, Уваравіцкі). Цэлы рад раёнаў (Веткаўскі, Гомельскі, Жыткавіцкі, Заслаўскі, Камарынскі, Крычаўскі, Нараўлянскі, Плешчаніцкі, Церахаўскі) стаяць на ніжкі завяршэньня кампаніі, дасягнуўшы 90-95 проц. Закончыў загатоўкі калгасны сэктар 21 раёну.

Але посьпехі гэтых раёнаў ня могуць перакрыць агульнага недапушчальна-вялікага недавыкананьня пляну.

Калгасы МТС рэалізавалі свой плян па ільнавалакне на 60,8 проц., іншыя калгасы — на 80 проц. і аднаасобны сэктар, уключаючы і кантрактантаў —39,1 проц. Агульна-рэспубліканскі плян выкананы усяго на 56,7 проц., а па групе асноўных ільнаводчых раёнаў—на 53,6 проц.

Аналіз лічбовых даных па апошніх днях і пяцідзёўкі, шматлікія факты аб сапраўдным апрацоўкі валакна, аб разбазараньні яго ў радзе сельсавецкіх і калгасных прадпрыемстваў і калгасаў паказваюць, што на мясцох у некаторых раённых арганізацыях і сельсаветах маюць месца тэндэнцыі, накіраваныя на згортваньне кампаніі.

Гэтыя тэндэнцыі жыцьцёвага дэмабілізацыйнымі апартуністычнымі настроямі і аргументуюцца «недасевам», «нерэальнасьцю плянаў», «адсутнасьцю валакна» і другімі падобнага роду «прычынамі».

Наўрад ці трэба даводзіць беспадстаўнасьць і апартуністычнасьць гэтых штучна зманістраваных «аргументаў». Даволі сказаць, што іменна **бальшавіцкая барацьба з апартуністычнымі панікёрамі, правільная арганізацыя работы па пераапрацоўцы, барацьба з кулацка-сланьвецкімі тэндэнцыямі забясьпечылі перамогу дзесяткаў перадавых сельсаветаў і сотень калгасаў.**

Іх прыклад работы павінен быць выкарыстан для крутога павышэньня тэмпаў загатовак. Нельга мірыцца з тым, што цэлы рад важнейшых ільняных раёнаў (Крупкі, Гарні, Лепель, Мсьціслаўе, Полацак, Сянно, Сураж, Чавусы) за дакату (20 лютага—1 сакавіка) далі прырост ад 0,2 да 0,4 проц., а некаторыя (Вушачы, Жыткавічы, Заслаўе і інш.) зусім спынілі загатоўкі.

Хіба ня ясна, што ў рабоце арганізацый гэтых раёнаў пануюць дэмабілізацыйныя настроі у ільнавых ільназагатовах.

Трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што барацьба супроць гэтых імкненьняў, супроць дэмабілізацыйных настроў зьяўляецца важнейшай умовай пасьпяховага завяршэньня кампаніі.

Разьбіваючы самацёчныя дэмабілізацыйныя настроі, выкрываючы іх апартуністычную сутнасьць, партыйныя арганізацыі павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на важнейшых вучастках загатоўчай работы.

Такім важнейшым вучасткам заказ зьяўляецца працэс **ПЕРААПРАЦОЎКІ.** Многія калгасы ня выканалі сваіх абавязацельстваў толькі таму, што дзесяткі тон трасты ляжаць непрацаванымі. Так, у калгасным сэктары аднаго Дубровенскага раёну ляжыць 2.000 цнт. неапрацаванай трасты, у калгасе імя Фрунзе, Полацкага раёну —70 тон. У асобных калгасах Талачынскага раёну ляжыць траста мінулага году. Рад калгасаў сарвалі плян здачы ільнакалакна таму, што працэсы пераапрацоўкі арганізаваны недапушчальна дрэнна. Адсутнасьць зьдзельшчыны, пастаянных брыгад, бескантрольнасьць работы пераапрацоўчых пунктаў ня толькі вядуць да зацяжкі кампаніі, але ствараюць спрыяючую глебу для праяўленьня рваўкіх тэндэнцый адсталых калгаснікаў, для разбазараньня валакна.

Нельга ні на хвіліну забываць, што кулак лёзе сваёй падрыўной дзейнасьці накіроўвае на гэты вучастак, што іменна тут ён імкнецца дэзарганізаваць ільняны канвэер, сарваць загатоўкі.

Кулацкая стаўка, а таксама і апартуністычныя тэндэнцыі на згортваньне кампаніі бухуць біты пры ўмове, калі максымум сіл партыйных арганізацый будзе скацэнтраваны на пераапрацоўчым працэсе.

У гэтых адносінах падзвычай карысным, заслугоўваючым усямернага падтрыманьня зьяўляецца паўны калгаснікаў Дрысенскага раёну. Арганізацыю ўсебеларускага ільнянога абозу калгаснікі Дрысеншчыны прапануюць ажыцьцявіць «пляхам правядзеньня суцэльнай праверкі выкананьня кантрактацыйных дагавораў у аднаасобным сэктары і максымальнага фарсаваньня апрацоўкі і здачы ільну калгасамі».

Поўнае выкарыстаньне мяльна-сушыльнага і трапальнага інвэнтару, трохзьменная нагрузка пераапрацоўчых пунктаў, арганізацыя пастаянных брыгад, укараненьне зьдзельшчыны, увядзеньне грашовай аплаты —вось сума тых простых і надзвычай важных мерапрыемстваў, якія вырашаюць посьпех пераапрацоўкі ільнавалакна.

Павінна быць абвешчана самая жорсткая барацьба кулацка-рваўкім сканцэнтраваным тэндэнцыям. Гэта дыктуецца канкрэтнымі фактамі разбазараньня ў радзе месц валакна. У Дуброўне, напрыклад, разбазараньне валакна сьмяшнікамі раёнкалгасаў зам, які дазволіў калгасам разьмеркаваць 30 проц. ільнавалакна паміж калгаснікамі **незалежна** ад выкананьня імі сваіх абавязкаў перад дзяржавай. У калгасе «Пераможца», Кохапаўскага сельсавету, Талачынскага раёну, 7 цнт валакна разьмеркавана сярод калгаснікаў, а заданьне ня выканана. Гэтыя тэндэнцыі ў цэлым радзе месц ня сустракаюць бальшавіцкага адпору.

Трэба дабіцца поўнага ўсьведамленьня кожнай ячэйкай, сельсаветам, праўленьнем калгасу, кожным камуністам, што шлях да пасьпяховага завяршэньня кампаніі ляжыць праз **бальшавіцкую барацьбу з кулацкай дзяльбой, з разбазараньнем і асяданьнем ільнавалакна.**

Гэта адносіцца ня толькі да калгасаў, але і да аднаасобнікаў, і ў прыватнасьці да тых кантрактантаў, якія дрэнна выконваюць свае абавязацельства. **Плян загатовак ільнавалакна па аднаасобным сэктары выкананы толькі на 38.9 проц.** У гэтым нетапупчальна нізкім проценце са ўсёй сілай сказваецца яўнае аслабленьне пасава-растлумачальнай работы, якое вынікае з недаацэнкі ў радзе месц. ролі аднаасобнага сэктару ў ільназагатоўках.

Імкненьні апартуністаў абвысьці аднаасобніка, кантрактанта, пакінуць гэты вучастак загатоўчай работы на самацёк, павінны сустрэць рашучую бальшавіцкі адпор усіх партыйных арганізацый. Нельга забываць, што аднаасобны сэктар павінен даць каля 50 проц. рэспубліканскага пляну ільнавалакна, што каля 80 проц. аднаасобнікаў — бедняцкіх і серадняцкіх сьяўляюцца кантрактантамі. Задача заключаецца ў тым, каб арганізаваць кантрактантаў на выкананьне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Высунутая «Праўдай» і падхопленая Дрысенскімі калгаснікамі і раённымі арганізацыямі прапанова аб **правядзеньні дэкадніка суцэльнай праверкі кантрактацыйных дагавораў** павінна сустрэць ня толькі падтрымканьне, але **неадкладнае ажыцьцяўленьне ва ўсіх раёнах нашай рэспублікі.**

Аналізуючы ход загатовак, нельга прайсьці міма факту недапушчальна-марудлівага стагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных элемэнтаў. Партыйныя арганізацыі павінны бязьлітасна выкрываць нікчэмную балбатню апартуністычных панікёраў аб тым, што «кулакоў няма», выганяючы з сваіх радоў кулацкіх падпявал і абаронцаў. Трэба прымусіць кулацка-заможныя гаспадарні поўнасьцю і ў найкарацейшы тэрмін выканаць цьвёрдыя заданьні.

Упартай настойлівай работай партарганізацый, сельсаветаў, мабілізацыяй мас калгаснікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за кожны кілёграм валакна забясьпечым поўнае выкананьне ільнянога пляну і пасьпяховую скарыстоўку да бальшавіцкай вясны.

Па прыкладзе Дрысенскіх арганізацый трэба ў кожным раёне правесьці аднаўмоўную суму мерапрыемстваў.

Выклік Дрысенскіх калгаснікаў на сацыялістычнае спаборніцтва, заклік арганізаваць усебеларускі ільняны абоз павінны быць вядомы кожнаму калгасу, кожнай брыгадзе, кожнаму калгаснику і аднаасобніку.

Адказам пераможцам ільнянага фронту павінны быць бальшавіцкія справы, тадэсятыя тэмпы работы на ўсіх працэсах апрацоўкі і загатовак ільнавалакна.

Тав. Гікало ў Гомелі

ГОМЕЛЬ, 10. (Наш кар.).

9 сакавіка ў Гомель прыбыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало. Тав. Гікало наведаў Шклобуд, Сельмаш, дрэваапрацоўчы камбінат, завод імя Ланцуцкага, кліменны завод. На гэтых прадпрыемствах тав. Гікало азнаёміўся з ходам работы. Асаблівую ўвагу ён аддаў пытаньню культурна - бытавых умоў рабочых. Тав. Гікало гутарыў з рабочымі і кіраўнікамі гэтых прадпрыемстваў. Вечарам тав. Гікало выступіў на зьлёце гомельскіх чыгуначнікаў, які адбыўся сумесна з дэлегатамі 2 канфэрэнцыі прафсаюзаў.

Разам з масамі змагацца за насеньне

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Скончылі збор насенфондаў

АРШАНСКІ РАЁН, КАЛГАС «ЗЬВЯЗДА»,
МЕНСКІ РАЁН, КАЛГАС ІМЯ ЦК КП(б)Б,
ЕЛЬСКІ РАЁН, КАЛГАС «ШЫРОКАЯ НІВА»,
ЧАВУСКІ РАЁН, КАЛГАСЫ «КАМУНА, «СЕРП І МОЛАТ», ІМЯ М. ГОРКАГА, «ЛЕНІНСКАЯ ПРАЦА», «РАНІЦА», «РАСЬСЬВЕТ», «ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ», «ДОБРАЯ ВОЛЯ», «НОВЫ БЫТ» І «ЗАРА КАСТРЫЧНІКА».

Практыку насеннай пазыкі ва ўсе раёны БССР

Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў для стварэньня насенных фондаў мае вялізнае значэньне. Значная частка калгаснікаў - ударнікаў, малочы астачу збожжа і іншага насеньня з мінулых гадоў, лішкі ад атрымання пры разьмеркаваньні ўраджаю на працадзён апошняга году — аказвае дапамогу свайму калгасу ў справе стварэньня насенных фондаў.

Раённая газета «Путь к социализму», Кінель - Чаркаскага раёну (Сярэдняя Волга) выпусьціла спэцыяльную насенную пазыку для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў самых калгаснікаў. Праз распаўсюджаньне гэтай пазыкі Кінэль-Чаркаскі раён сабраў звыш 1.000 цэнтнераў збожжа. Вопыт выданьня такіх насенных пазык шырока падхоплен іншымі раёнамі Сярэдняй Волгі, Украіны, Паўночнага Каўказу.

Пазычанае калгаснікамі насеньне, праўленьне калгасу, згодна абавязацельства па аднаўленьне аблігацый насеннай пазыкі зьвяртае калгаснікам зараз-жа пасьля ўборкі ўраджаю 1932 г.

У БССР насенныя пазыкі па прыкладу Кінэль-Чаркаскага раёну ўжо выдалі газэты **«Палеская праўда»** і **«Віцебскі пралетары».**

Газэта **«Рабселькор»** разам з **калгасцэнтрам** выдаліла насенную пазыку імя конкурсу **«Праўды».**

Задача раённага саўгасна - калгаснага друку і селькораў БССР пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый узяцца па-баявому за распаўсюджаньне гэтай насеннай пазыкі. Газэты і калгасы не павінны абмяжоўвацца зборам насеньня праз гэтыя пазыкі толькі для стварэньня фондаў для сваіх калгасаў. Насенныя пазыкі павінны быць шырока выкарыстаны таксама для стварэньня фондаў між-калгаснай і міжраённай дапамогі.

Калгас „Случ" № 2 рэалізуе пастанову ЦК КП(б)Б

СЛУЦАК (ад наш. пэцкора)

Пасьля апублікаваньня ў газэце «Зьвязда» пастановы ЦК КП(б)Б аб чарговых задачах арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў здзіў з першых калгасаў. Случчыны **«Случ»** № 2 па бальшавіцку рэалізаваў гэту пастанову арганізацыяй пастаянных брыгад (зьяўляюцца ўдоўж — брыгада ўжо працуе даўно і зарэкамендавала па ўдось год.).

Праўленьне калгасу арганізавала 3 палявыя брыгады на ўдось год. Першая брыгада складаецца з 24 мужчын і 36 жанчын, з аднаверстай цягай і гівэнтарэм за тэхнічных культурах і бульбе, якая пасьпела вагацца 20 га ільну, 120 га бульбы і зрабіць уборку гэтых самых культур. Другая брыгада па збожжавых культурах са складам 25 чал. (14 муж. і 11 жанч.) і трэцяя брыгада па гародных культурах з 15 чал. (7 муж. і 8 жанчын).

Брыгадзірам выдзелены вопытныя калгаснікі, ленінцы ўдарнікі.

Нормы выпрацоўкі абгаворваны на агульным сходзе і ўхвалены. Намечана сяўбу правесьці за 25 дзён.

Калгас праводзіць агляд конскай цягавай сілы.

Пяўхільна ажыцьцяўляючы пастановы ЦК камуністычнай партыі, пераносячы працу ў брыгаду, выхоўваючы калгасны актыў, — «Случ» № 2 у 1932 годзе дабіўся яшчэ больш посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. **Б. Х.**

Аб ходзе работы па арганізацыі брыгад у калгасах, падрыхтоўцы брыгадзіраў і арганізацыі ўліку

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

Прызнаць недаваньняючым разгортваньне практычнай работы на выкананні пастановы ЦК аб арганізацыі брыгад у калгасах і падборы брыгадзіраў. Амаль за ўсіх раёнах канкрэтная работа па арганізацыі брыгад яшчэ не разгорнута.

Такое становішча ЦК тлумачыць выключна недаацэнкай гаспадарча - палітычнага значэньня свалачасовай і правільнай арганізацыі брыгад і выліку чэньня брыгадзіраў, як аднаго з рашаючых мерапрыемстваў па ліквідацыі абвылічкі, ураўнілаўкі, укараненьні зьдзельшчыны і забясьпячэньні пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы, ЦК пастанаўляе:

1. Абавязаць калгасаюзы МТС і РК КП(б)Б безадкладна правесьці работу па складаньні вытворчых пляноў, мабілізацыі неабходную колькасьць работнікаў і калгаснага актыву, шырока выкарыстаўшы культурныя сілы раёну для практычнай работы па складаньні пляноў.

Студэнтаў і спэцыялістаў, камандыраваных у раёны для складаньня вытворчых пляноў, пакінуць да асобнага распараджэньня.

2. Абавязаць РК КП(б)Б і калгасаюзы ўстанавіць у кожным раёне канкретны каляндарны плян арганізацыі брыгад у калгасах, забясьпечыць поўнае скарыстаньне накіраваных у раёны 400 чал. студэнтаў с.-г. ВНУ і цэнтральнай калгаснай школы. Мабілізаваць дадаткова неабходную колькасьць работнікаў на мясцох з такім разьлікам, каб уся работа па арганізацыі брыгад і прызначэньні брыгадзіраў была скончана да 1 красавіка на ўсіх раёнах.

3. Правесьці ва ўсіх раёнах, не пазней 3-5 красавіка 3-5 дзённыя курсы-канфэрэнцыі брыгадзіраў (асобна па жывёлагадоўлі і расьлінагадоўлі) для інструктаваньня па пытаньнях арганізацыі працы ўнутры брыгад у часе веснавой сяўбы, аб ролі і задачах брыгадзіра.

Абавязаць Калгасцэнтр выдаць на працягу дэкадзкага тэрміну палажэньне-інструкцыю аб рабоце брыгад і брыгадзіраў па асобных спэцыялізаваных галінах гаспадаркі.

4. Абавязаць РК КП(б)Б праверыць работу калгасных сыстэмы па падрыхтоўцы брыгадзіраў. Абавязаць Калгасцэнтр прыняць меры, якія забясьпечвалі-б падрыхтоўку ня менш 20.000 чалавек брыгадзіраў да веснавой сяўбы.

5. Калгасцэнтру, калгасаюзам і РК КП(б)Б правесьці ва ўсіх раёнах 15-17 сакавіка нарады старшынь калгасаў для інструктаваньня па пытаньнях арганізацыі брыгад і прызначэньня брыгадзіраў.

Калгасцэнтру і НКЗ правесьці ў часе агра - зоатэхнічнага зьезду інструктаваньне раённых агрономаў і работнікаў калгасаюзаў, якія прысутнічаюць па зьезьдзе, па пытаньнях арганізацыі брыгад і прызначэньня брыгадзіраў.

6. Прапанаваць НКЗ укалочыць у апэратыўную справаздачнасьць аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы, прадстаўленню раёнамі пяцідзёнак і звэдак аб ходзе арганізацыі брыгад і прызначэньні брыгадзіраў.

7. ЦК указвае ўсім РК КП(б)Б і калгасным арганізацыям на важнейшае значэньне ў арганізацыі працы правільнай пастановкі ўліку, ў сувязі з чым прапануе прыняць меры да свалачасовага забясьпячэньня калгасаў матар'яламі па ўліку. Правесьці дэтальнае інструктаваньне работнікаў уліку па пытаньнях вучоту маёмасьці і працы.

Абавязаць ЦСПСБ мабілізаваць на 15 дзён 300 бухгальтараў з Менску, Віцебску і Гомелю і інш. буйных гарадоў для аказаньня дапамогі калгасам па ўстанаўленьні ўліку на 1932 год.

Апублікаваць гэту пастанову ў друку.

Апартуніст Вялікарусаў лічыць плян нерэальным

ТАЛОЧЫН. (Па тэлефону ад нашага спэцкора)

У гэтым годзе пад тэхнічнымі культурамі плянуецца быць засеяна 11.608 гэкт., для чаго трэба 19.000 цэнтн. ільнасемя. Сярод некаторых раённых работнікаў пануюць апартуністычныя разважаньні, што насеньня няма дзе ўзяць. У выніку — насеньня ільну сабрана толькі 30 проц. Загатоўкі ільнасемя спыніліся. Загатоўчыя арганізацыі абмежаваліся тым, што выканалі гадавы плян на 61,3 проц. Загадчык Насенканторы тав. Вялікарусаў заявіў, што плян загатовак насеньня тэхкультур і траў нерэальны. З 12 сельсаветаў да гэтага часу няма вестак аб зборы насенфондаў тэхкультур. Па аднаасобным сэктары ўліку няма. Між тым, факты гавораць, што лішкі насеньня ў раёне ёсьць і шмат яго вывозіцца на прыватны рынак. Гэта асабліва выявілася на Паўлаўскім сельсавеце.

Райза, райкалгасаюз і МТС не арганізоўваюць загатоўкі насеньня тэхкультур, а толькі займаюцца зборам зводак.

Адсталы Кручанскі сельсавет увесь час скарджыўся на недахоп насеньня. Між тым, калі была праведзена растлумачальная работа, збор насеньня тэхкультур аказаўся выкананым на 100 проц.

Практыка Кручанскага сельсавету паказала, што плян збору насеньня тэхкультур можа быць ня толькі выкананы, але і перавыкананы. **Козік.**

ДЗЬВЕ ПАРАЛЕЛІ

ВУЗДА. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Характэрным прыкладам стаўчай і адпоўчай работы ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы служаць два калгасы Вуздзенскага раёну: першы калгас «Будаўнік», Камышоўскага сельсавету, і другі калгас «Перамога», Сяменаўскага сельсавету.

Гэтыя два калгасы амаль прыблізна адпаўсюдную плошчу пасеву і вольнасьць гаспадарак, маюць адпаўсюдны вопыт барацьбы першай і другой бальшавіцкай вясны. Калгасы ўжадаюць прыблізна адпаўсюднымі кроткамі антыпрачасьці, цягавай і рабочай сілай.

Паглядзімо зараз, як калгасы здолелі справіцца з усталяванай на іх задачай.

Калгас «Будаўнік» на сёньняшні дзень ўжо поўнасьцю падрыхтаваўся сустрэць вясну. Сеўбаны і ачышчаны на 100 проц. насенфонды, канчатковна сарэкамендаваны с.-г. інвэнтар. **Калгаснікі зараз прыступілі да рамонту тых прылад, якія будуць знадобіцца ў разгаре.**

Два тыдні таму назад калгас склаў вытворча-фінансавы плян, які пыркова прагрэсаваны на сходзе калгаснікаў. Отворана пастаянная брыгада і да іх прыкмацаваны на ўвесь гаспадарчы год вытворчыя сучоты. Праўленьнем дабіўся таго, што кожная брыгада, калгаснік добра ведаюць, што што будзе сеяць калгас, якія ў калгасе будуць спрыяцца работы, што кожны з іх будзе рабіць і колькі будзе награкаваны працадзён на тую ці іншую работу. Такасама складзена работы сілы веснавой сяўбы. Можна быць упэўненым, што калгас «Будаўнік» выпрыкае баявы экзамен у падрыхтоўцы да вясны.

Вось другі калгас «Перамога».

Праўленьне гэтага калгасу, арганізуючыся аб'ектыўнымі прычынамі, да апошняга часу плачыцца на лаўрах. Толькі 6-та сакавіка прыступілі да рамонту плугоў, ужо с.-г. інвэнтар разьбіты, расхіцаны. Амаль за тры гады працы калгас ня меў арганізацыі поўнасьцю асноўныя сродкі вытворчасьці. Калёсы і самі схаваны ў калгаснікаў, уся лепшая збруя разбазарана. У калгасе адарыта працуе кулак Карачун Васіль, да якога праўленьне калгасу баялася прыняць рашучыя меры. Член праўленьня Шавель Паўлюк ня хоча арганізаваць калёсы і самі.

Яшчэ не абмалочана насенная капюшына, таксама не абмалочаны капюшы.

Ня гледзячы на тое, што ў калгасе ёсьць 5 пастаўчыкаў, цагатуль ня складзен вытворча-фінансавы плян, ня зроблена рэвізія калгаснага разьмеркаваньня ўраджаю. На сёньняшні дзень калгас прапаліў спатрэбнае заканчэньне падрыхтоўкі да сяўбы. Такое ганебнае дэзэртырства, нежаданьне спатрэбаваць выпрацаць асноўнае рашаючае зьвяно ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу, сьвядчыць аб тым, што калгас засьмечан кулацка-заможнымі гаспадарнікамі і патрабуе неадкладнай апытыці ад варожых элементаў і рашучага ўмацаваньня.

Прыведзены вышэй калгас «Будаўнік» практычна паказвае, як трэба не на словах, а на справе, не адмякоўваючыся, як калгас «Перамога» аб'ектыўнымі прычынамі, на баявому рыхтавацца да вясны, каб быць пераможцамі ў часе сяўбы.

Пры ўмове выкананьня задач, якія ўжо ажыцьцяўляў калгас «Будаўнік», калгасы Вуздзенчыны на-баявому падрыхтуюцца і вытрымаць веснавую сяўбу.

М. ВІШНЕЎСКІ.

Да 15 гадавіны лютаўскай рэвалюцыі

15 год таму назад скінута расійскае самаўладзтва.

Лютаўская рэвалюцыя прышла не самацёкам. Арганізуючая роля нашай партыі была на ўсіх этапах рэвалюцыі. Толькі трацкісцкія фальсыфікатары могуць адмаўляць факт кіруючай ролі партыі бальшавікоў у барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Наша партыя аказалася з масамі, з рэвалюцыйным пралетарыятам, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ на арышт і высылку ў Сібір яшчэ ў 1914 годзе нашых дэпутатаў, ня гледзячы на паасобныя прасьледаваньні і арышты, якім падпадаў цэнтрбурскі камітэт за сваю нелегальную работу ў часе вайны супроць вайны і супроць царызму». (Ленін). У жорсткай клясавай барацьбе і ў барацьбе на два фронты, авангард пралетарыяту — бальшавіцкая партыя зацёсьці яшчэ разам з масамі, на чале мас.

Лютаўская рэвалюцыя здбылася іменна дзякуючы спалучэньню «цэлага рэду ўмоў сусьветнай гістарычнай важнасьці». У рэзультаце рэвалюцыі дзяржаўная ўлада перайшла «ў рукі клясы буржуазіі і «абуржуазившихся» помешчыкаў». Своеасаблівасьць лютаўскай рэвалюцыі заключаецца ў тым, што яна стварыла двахпладзтва. Побач з часовым ўдарам ісйавалі саветы.

Меншавікі, эсэры, якія прадстаўлялі большасьць у саветах, з першых-жа дзён сваёй «работы» цапкам і поўнасьцю падпарадкавалі сябе ўладзе Мілюковых, Гучковых і ў інтарэсах буржуазіі, праз саветы, імкнуліся да ажыцьцяўленьня не сацыяльнага заказу.

Подпад здрадніцтва рабочай клясы, якое праводзілася меншавікамі і эсэрамі ў савеце петраградзкіх дэпутатаў, было натуральным заваяваньнем усяго шляху рускага меншавізму, як часткі міжнароднага сацыял-фашызму.

«На працягу ўсяго першага перыяду рускай рэвалюцыі, саветы памяняліся, расьлі і ўмацоўваліся на ўпасным вопыце, зжываючы ілюзіі згодніцтва з буржуазіяй, апушчэньня, форм буржуазна - дэмакратычнага парляментарызму, прыходзячы практычна да вываду аб немагчымасьці вызваленьня прыгнечаных клясаў без разрыву з гэтымі формамі і з усялякім згодніцтвам. Такім разрывам зьявілася Кастрычніцкая рэвалюцыя, перабудзшая ўсю ўладу ў рукі саветаў». (Ленін).

8 месяцаў панаваньня буржуазіі і памешчыкаў, пры непарадным падтрыманьні і абароне меншавікоў і эсэраў паказала, што ні адно з патрабаваньняў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ня было даведзена да канца. Часовы ўрад і іх лёкаі — меншавікі і эсэры — ня толькі не прынялі мер да зьнішчэньня крывавай бальшэвыцкай бойні, але, абараняючы інтарэсы буржуазіі, яны самі праводзілі гэту вайну.

Лозунг нацыяналізацыі зямлі быў ня выкананы. Ды яны і ня ставілі яго ў сілу свайго клясавага становішча.

Нацыянальная нераўнасьць засталася па-ранейшаму. Свабода друку, свабода слова, свабода асобы, засталася для працоўных нявырашанай. Панаваньне буржуазіі яшчэ больш закабаляла ўсякую свабодную мысль. Разьняволеньне жанчыны, пытаньні рэлігіі і г. д. засталіся незачапанымі.

Іменна саюз меншавікоў і эсэраў з кадэтамі даваў магчымасьць так нагла, так злачынна, так цынічна праваляваць усе асноўныя рашаючыя пытаньні, якія сталі перад буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй, «Гэтыя трусы, балтуны, самаўлюбёныя нарысы і гімназіцкі махалі картонным мячом і нават манархізму ня зьнішчыліся (Ленін).

Яны (меншавікі і эсэры) ня толькі ня ставілі перад сабой мэты выразьненьня задач, якія сталі перад буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыяй, а, наадварот, усе іх палітыка была накіравана на тое, каб умацаваць дыктатуру буржуазіі.

Ленінская пастаноўка пытаньня аб пераростаньні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную цалкам і поўнасьцю апраўдваецца на прыкладах лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Лютаўская рэвалюцыя была прелёгам сацыялістычнай рэвалюцыі.

Яшчэ на VI зьезьдзе партыі т. Сталін з усёй бальшавіцкай пэўнатой выразна сфармуляваў ленінскую ацэнку пэрспэктыў рускай рэвалюцыі: «ня выключана магчымасьць, — газарыў ён, —што іменна Расія зьявіцца краінай, якая пракладзе шлях да сацыялізму». Гэта ўстаноўка знайшла сваё поўнае адпаўтаваньне ва ўсёй праграме партыі. «Мы давялі буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю да канца, як ніхто. Мы зусім сьвядома, цьвёрда і няўхільна прасоўваемся наперад да рэвалюцыі сацыялістычнай, ведаючы, што яна не аддзелена кітайскай сьцяной ад рэвалюцыі буржуазна - дэмакратычнай». (Ленін). Задачы, якія сталі перад буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй мы вырашылі... «походам», «мимоходом», як пабочны прадукт нашай галоўнай і сапраўды пралетарскай рэвалюцыі работы». (Ленін).

У жорсткай клясавай барацьбе з буржуазіяй і памешчыкамі і як прыхвасьнямі — меншавікамі і эсэрамі, пралетарыят пад кіраўніцтвам партыі Леніна ў Кастрычніку захапіў уладу ў свае рукі.

Праблема пераростаньня буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную ёсьць прапутоплены ня ў ленінскага вучэньня аб характары і рухавых сілах рэвалюцыі.

Трацкісцкія фальсыфікатары сканаючы гісторыю бальшэвізму інтэрпрэтуюць гэтае цэнтральнае пытаньне. Яркім узорам меншавіцкай сьцыяналісцкай фальсыфікацыі гісторыі бальшэвізму і меншавіцка - трацкісцкай ацэнкі рэвалюцыі 1917 году зьяўляецца «труды» Шляпнікава.

Ліст тав. Сталіна ў журнал «Пролетарская революция» ўскрывае сутнасьць трацкісцкіх кантрабандыстаў, заклікаючы ўсю партыю да падняцця бальшэвіцкай пільнасьці, да барацьбы за бальшэвіцкае вывучэньне гісторыі партыі. Толькі трацкісцкія кантрабандысты і фальсыфікатары, скажаючы гісторыю бальшэвізму могуць адмаўляць арганізуючую ролю нашай партыі на працягу ўсяго яе існаваньня.

Бальшэвіцкая партыя пад кіраўніцтвам ЦК у кастрычніцкія дні вяла самую рашучую барацьбу на два фронты. Накіроўваючы галоўны агонь супроць адкрытага «штрэйбрэхэрства» Каменева і Зіноўева, у той-жа час партыя змагалася і з канстытуцыйнымі ілюзіямі Троцкага, які зьвязваў паўстаньне з надыходзячым зьездам саветаў.

Напярэдадні Кастрычніцкага паўстаньня Ленін аб помылках Троцкага пісаў: «Марудзіць — злачынства, чакаць зьезду саветаў — дзіцячая гульня ў фармальнасьць, недарэчная гульня ў фармальнасьць, эдрадніцтва рэвалюцыі, трэба змагацца з канстытуцыйнымі ілюзіямі». Год гісторыі разьбіў ушчэнт тэорыі трацкістаў з іх «парманэнтнай», разьбіў на-галаву ўсякія апартуністычныя хістаньні, бальшэвізм загартоўваючы свае рады ў барацьбе на два фронты, перамог.

Толькі жалезная дысцыпліна, ленінскае кіраўніцтва нашай партыі забясьпечыла перамогу пралетарскай рэвалюцыі, дала магчымасьць разгарнуць грандыёзнае будаўніцтва сацыялізму. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыла нябывалыя ў гісторыі чалавецтва магчымасьці для разьвіцьця вытворчых сіл, для пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Да чатырохгодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, падагульваючы вынікі праробленай работы, Ленін пісаў: «Савецкі лад ёсьць іменна адно з нагладных пацьвярджэньняў, або праяўленьняў гэтага перарастаньня адной рэвалюцыі ў другую. Савецкі лад ёсьць максымум дэмакратызму для рабочых і сялян і ў той-жа час ён азначае разрыў з буржуазным дэмакратызмам і ўзьнікненьне НОВАГА, сусьветна-гістарычнага ТЫПУ дэмакратыі іменна пралетарскага дэмакратызму або дыктатуры пралетарыяту». Наша партыя праз фронты грамадзянскай вайны, праз адзіноцтвы перыяд, праз перыяд разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, у жорсткай клясавай барацьбе як з замежнымі, так і ўнутранымі ворагамі і апартуністамі высока несла сьцяг марксызму-ленінізму, вялына ахоўвала яго ад усякіх спроб з боку апартуністаў замяніць ленінскую лінію. На аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня ганэральнай лініі партыі, зараз у краіне Саветаў завершана пабудова фундамэнту сацыялістычнай эканомікі. СССР стала краінай самага буйнага зьмяроўства ў сьвеце. Калгаснік зьяўляецца цэнтральнай фігурай сацыялістычнага зьмяроўства, надзейнай і моцнай апорай савецкай улады на вёсцы. Растуць гіганты сацыялістычнай індустрыі. Значна палепшыліся матар'яльнае становішча працоўных. Зьмяніліся суадносіны клясавых сіл, на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя цьвярдыня капіталізму ў нашай краіне — кулацтва, як кляса. XVII партканфэрэнцыя паставіла задачай — у другую пяцігодку канчаткову ліквідацыю кляс і крыніц, якія параджаюць клясовую рознасьць, пабудаваньне бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Ажыцьцяўленьне гэтых грандыёзных задач патрабуе далейшай бязьлітаснай барацьбы на два фронты, асабліва супроць правага апартунізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, і «левага» галоўнай небясьпекай, і «левага» прыміраніцтва і гнілога лібералізму.

Ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі «як частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюц

Г. ТАУ

РОСТ УЗБРАЕНЬНЯЎ І ПАДРЫХТОЎКА АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ

Мірныя пакты, шматлікія прамовы, разбраенчыя кампаніі — з аднаго боку; расстрэлы рабочых дэманстрацый, карныя экспедыцыі ў рэвалюцыйныя сялянскія раёны, узброеная акупацыя тэрыторыі самастойных дзяржаў, або ўжо падзеленых паміж імперыялістамі калёніяльных уладаньняў—з другога боку—вось той фон, на якім адзе далей шалёны рост узбраеньня імперыялістычных дзяржаў і ліхаманкавая работа генэральных штабаў па падрыхтоўцы новых імперыялістычных войнаў, — у першую чаргу імперыялістычнай супроць СССР.

Каб ня быць галаслоўнымі, прыведзем некаторыя, найбольш характэрныя лічбы аб росьце ўзбраеньняў. Лік сухаземных армій 5-ці важнейшых імперыялістычных дзяржаў (Францыя, Англія, ПАЗШ, Італія, Японія) прыкладна стаіць на ўзроўні 1913 году (2,1 млн. чал.). Некаторыя дзяржавы (Францыя, Англія) любяць паваж казываць тым, што колькасны склад іх армій за апошнія гады памяньшыўся і што, таму яны, моў, ужо ў выстрачальнай ступені «скарачаліся». Гэта зараз «улюбёны ліпёк» імперыялістаў. Але трэба сказаць, што адзін лік сучасных армій далёка не акрэсьлівае сапраўднай магутнасьці ўзброеных сіл. На данай стадыі разьвіцьця ўзбраеньняў пераважнае значэньне мае тэхнічнае асьнашэньне армій як у колькасных, так і ў якасных адносінах. Так, прыкладна, пры тай-жа колькасьці амэрыканскай пяхотнай дывізіі вазьмем чаку (23 тыс. чал.) сіла ружэйна-кулямётнага агню ў параўнаньні з 1914 г. павялічылася ў 2—2 з пал. разы (з 163.000 стрэлаў у мінуту у 1914 г. і 422.000 —у 1932 г.). Амаль пастолькі-ж павялічылася сіла артылерыйскага агню (8,1 тон знарадаў у адну мінуту ў 1914 г. і 17,6 тон у 1932 г.).

Калі звычайны кавалерыйскі полк амэрыканскай армії колькасьцю из 1.000 байцоў мае толькі 64 кулямёты і 3 дробнакаліберныя гарматы, то такі-ж полк, але поўнасьцю механізаваны, г. зн. з байцамі, пасаджаны на машыны, мае 46 кулямётаў, 26 розных тыпу гармат, 20 танкаў і 11 бронявікоў. Ясна, што баявая магутнасьць такога механізаванага і «кавалерыйскага» палка ў некалькі разоў большая любога другога палка звычайнага тыпу.

Дасягненьні авіяцыі вядомы. Калі немцы на працягу ўсёй імперыялістычнай вайны скінулі на тэрыторыі Англіі ўсяго толькі 280 тон бомб, дык зараз адна авіяцыя мірнага часу вялікіх імперыялістычных дзяржаў можа у адзін палёт скінуць у 8 з пал. разоў больш бомб.

На працягу імперыялістычнай вайны ўсе ваюючыя дзяржавы разам узятыя загатовілі ўсяго 13.000 тон іпрыту для мэтаў хэмічнага нападу. У выпадку новай імперыялістычнай вайны вытворчая магутнасьць адных толькі хэмічных заводаў ПАЗШ на меньш 1.000 тон у суткі, г. зн. на працягу якіх-небудзь ½ месяца прамысловасьць адных толькі ПАЗШ пакрые агульную вытворчасьць іпрыту за ўвесь 1914-18 год.

Далаво сюды вялізарны рост ваенных расходаў усіх імперыялістычных дзяржаў (па 5 вялікіх дзяржавах у 2 разы ў параўнаньні з 1913 г.), рост ваенна-фашысцкіх арганізацый, палёную імперыялістычную прапаганду і т. д. і нам стане ясным, што ўсякія мудраваньні дыплёматаў той ці іншай капіталістычнай дзяржавы аб памяншэньні ўзбраеньняў ёсьць толькі прыкрыцьцё для далейшага росту узбраеньняў. Кожная імперыялістычная дзяржава з пенай па вуснах імкнецца даказаць «скарачэньне» сваіх узбраеньняў (шляхам запуканскіх «замбінацый» з колькаснасьцю армій, памяншэньнем афіцыяльнага ваеннага бюджэту і інш) і павялічэньне чужых.

Але ёсьць і пралетарыяцкі капіталістычных дзяржаў, якія ня любяць гаварыць аб разбраеньні і, якія проста і адкрыта патрабуюць павялічэньня ўзбраеньняў.

Імкнна необходнасьць надыходзячай узброенай барацьбы супроць СССР і супроць рабочай клясы ў сябе дома вымушае тым асабліва вялікім аргументам, які выратае далейшы пашырэньні і шкарэй тэмп узбраеньняў.

Англія, якая ў прыродзе выступае супроць «міжвароцнай палітэйскай арміі» французскага імпэрыялізму, усё-ж ня супярэчыць супроць ролі Францыі, як міжнароднага жандара ў барацьбе супроць СССР.

«Сучасная Польшча... правільна лічыць сябе аппотам цывілізацыі супроць азіяцкага варварства. Яна зкупуе нашай поўнай сымпатыі... Калі рускія і палякі ў мінулым былі ў стане канфлікту... дык Францыя пічыла магчымым паспаць місію генэралаў для сапраўднай дапомгі сваёй саюзніцы. НЕШТА БОЛЬШАЕ, ЧЫМ ГЭТА, НЕАБХОДНА БУДЗЕ Ў БУДУЧЫМ».

Супроць агульнага ворага СССР імперыялістычная Англія сама гатова пайсьці на ўступкі. Яна шукае рынкі Францыі, у выніку імпэрыялісты пасылаць супроць Фырвовай армії «нешта большае», чым генэральскую місію 1920 г.

Паслыхавае выкапаньне першай пяцігодкі і «страх» перад шматлікімі другой не даюць супакою імперыялістам. Будаўніцтва магутнага Уральскага індустрыяльнага цэнтру, алкрыцьцё Турксібу і г. д., якія ставяць пачатак магутнаму прамысловаму і культурнаму узьдыму ўсяго Савецкага Саюзу ў процівагу Кітаю і Індыі, што эксплёатуюцца імперыялістамі, выклікае шалёную нянавісьць з боку капіталістычных прадпрыемцаў і іх лёкаёў—сапраўдных фашыстаў усіх масьцей да першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы, адно імкнаньне якой ровалюцыянізуе працоўныя масы ўсяго сьвету. Каб паскорыць з пенавісным іх Савецкім Саюзам імперыялісты ліхаманкава рыхтуюцца да інтэрвэнцыі.

Ідэолёгі «імперыялізму» гавораць аб гэтым зусім адкрыта.

«Французская прапаганда, ухваленая танкэма усімі сумежнымі з Расіяй дзяржавамі, у тым ліку і Фінляндыяй, і Японіяй, базуецца на тым, што сур'ёзна прыступіць да разбраеньня нельга раней, чым у становчым сэнсе БУДЗЕ ВЫРАШАНА ПЫТАНЬНЕ аб бясьпечнасьці».

Грукат гармат у Кітаі, антысавецкія прыгавары па Далёкім Усходзе лагічны мабілізацыі увагі працоўных СССР на ўзмоцненьне тэмпаў сацыялістычнага, на выкапаньне 5 годкі ў чатыры гады. Мы гайны на хочам, але абаранець бацькаўшчыну працоўных гатовы ў кожную хвіліну. Імперыялісты імкнуцца вырашыць не прыгэрысьня свае супярэчнасьці, імкнуцца знайсьці выхад з крызісу ў новай імперыялістычнай вайне, у першую чаргу ў вайне супроць СССР. Работая класа СССР адказа на гэта ўзмацненьнем тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, узмацненьнем Чырвонай Арміі і ўзмацненьнем абароназдольнасьці краіны.

Рабочая класа і працоўныя за чырвонымі рубяжамі яшчэ мацней згуртуюцца вакол сваіх камуністычных партый з тым, каб у рашаючы момант імперыялістычную вайну супроць СССР абярнуць у вайну грамадзянскую.

Партыйнае будаўніцтва

ПАРТЫЙНА-МАСАВУЮ РАБОТУ Ў ЦЭХУ, У БРЫГАДЗЕ

штодзенна спалучаць з задачамі барацьбы за высокія колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну

Вопыт перадавых—ва ўсе вытворчыя зьвеньні

Вытворчыя посьпехі кожнага прадпрыемства вырашаюцца правільнай арганізацыяй працы на аснове поўнага ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна, канкрэтнасьцю і апэрацыйнасьцю ў рабоце кіруючых органаў.

У галіне перабудовы работы па-новаму, многія партарганізацыі маюць вялізарнейшы вопыт. Перанясеньне цэнтру цяжару партыйна-масавай работы ў нізавыя вытворчыя зьвеньні, дзе працуецца выкананьне прамфінпляну, сыстэматычнае канкрэтнае кіраўніцтва работай партгруп дае бліскучыя колькасныя і якасныя паказальнікі.

У якасьці ілюстрацыі такога становішча, як на адзін з многіх фактаў можна паказаць на работу раду нізавых партызвеньняў Менскага прэзэкапрацоўчага заводу. Ініцыятыва камуністаў, якія працуюць непасрэдна ля вярстату (лесапільны, такарны цэх) знайшла сваё адлюстраваньне ў пераходзе брыгад гэтых цэхаў на вышэйшыя формы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Брыгады перайшлі на гаспадарчы разрахунак, наладжана зьмешана-сустрэчнае плянаваньне. У результаце такой пастановкі работы прамфінпляну ў гэтых брыгадах перавыконваецца пры значным паляпшэньні якасьці прадукцыі.

Шмат станоўчых момантаў мае ў сваёй рабоце па забесьпячэньні выкананьня прамфінпляну партыйны калектыў пішэйнай фабрыкі «Кастрычнік». Вельмі важнае мерапрыемства кіраўніцтва партакалектыву ў адносінах правядзеньня конкурсу на лепшую брыгаду і істужку. Праведзены ў лютым конкурс забясьпечыў далейшы рост гаспадарча-разрахунковых брыгад і выканаўне з перавышэньнем прамфінпляну. Ініцыятыва парткалектыву ў правядзеньні конкурсу на лепшае низавое вытворчае зьвяно, бязупоўна, заслугоўвае быць перанесенай на другія прадпрыемствы.

Асноўнымі торазамі выкананьня прамфінпляну на радзе прадпрыемстваў зьяўляецца невыстарчальная ячэйка барацьба за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў нізавыя вытворчыя зьвеньні, за ліквідацыю абязьлічкі, за максымальнае выкарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў. Далёка ня ўсюды наладжана сыстэматычная праверка выкананьня дырэктыў. На ліквідацыі гэтых недахопаў партарганізацыі павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу, забясьпечваючы павышэньне авангардной ролі камуністаў на вытворчай рабоце.

Троба памятаць, што барацьба за поўнае выкананьне па ўсіх паказальніках прамфінпляну 1932 г. ёсьць сустаўная важнейшая частка ўсёй падрыхтоўчай работы да другой пяцігодкі, задачы якой маюць сусьветна-гістарычнае значэньне. Абавязак кожнай партарганізацыі па-бальшавіцку ўсначаліць узрастаючую творчую актыўнасьць рабочых мас, бязьлітасна змагаючыся ў сваіх радах з усякімі праяўленьнямі апартунізму ў тэорыі і на практыцы.

Важнейшым вагаром барацьбы за прамфінплян зьяўляецца далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Для кожнага прадпрыемства ў правядзеньні ўдарніцтва і спаборніцтва павінна быць асноўным лёзунгам: «пры наяўных матар'яльных сродках, на аснове большай эканоміі, лепшага выкарыстаньня вытворчых магчымасьцяй, лепшай мабілізацыі сіл і лепшага практычнага кіраўніцтва, даць краіне больш прадукцыі і лепшай якасьці» (з пастановы XVII партканфэрэнцыі).

Камуністы—у авангардзе

Перадавыя цэхі і брыгады менскага прэзэкапрацоўчага заводу маюць на дзённым паказальніку выкананьня вытворчых заданьняў. За першыя 2 якады лютага такарны цэх заводу выканаў свой прамфінплян на 115 проц., лесапільны цэх — на 99,13 проц. Пазоснымі брыгады такарнага, лесапільнага і загатоўчага цэхаў сыстэматычна перавыконваюць прамфінплян.

Вытворчыя посьпехі больш паказальны на тых вучастках, дзе працуюць расстаўлены партыйныя сілы, дзе праводзіцца работа на аснове выкананьня 6 умоў т. Сталіна. Многія партыйныя групы на справе ажыцьцяўляюць канкрэтнае і апэрацыйнае кіраўніцтва на вытворчых вучастках сваёй работы, зьяўляюцца ініцыятарамі сацыялістычных форм і мэтадаў працы.

На ініцыятыве камуністаў брыгады такв. Булавы ў лесапільным цэху на раме № 2 была арганізавана першая на прадпрыемстве гаспадарча-разрахунковая брыгада. Зараз гэта брыгада сыстэматычна перавыконвае прамфінплян (112 проц.). Гэтыя посьпехі дасягнуты ў результаце перамаганьня косьнасьці з боку адміністрацыі. Загадчык цэху Кастроль на працягу 4-х дзён не хацеў падпісаць дагавор, зяўляючы: «з гэтага нічога ня выйдзе». Аднак, справа паказала другое, і на прыкладзе брыгады такв. Булавы на заводзе арганізаваўся яшчэ рад гаспадарча - разрахунковых брыгад, якія выконваюць прамфінплян на 105 — 118 проц. і т. д.

Партгрупа такарнага цэху забясьпечыла на сваім вытворчым вучастку перавыкананьне прамфінпляну на 15,27 проц., зьніжэньне сабекошту амаль на 10 проц. і поўнае зьніччэньне браку. Камуністы гэтай брыгады — бяздэтагры сустрэчнага плянаваньня і разгортваньня індывідуальнага спаборніцтва — паказываюць узорныя тэмпы работы.

Член партыі такв. Гольц сыстэматычна перавыконвае сваё заданьне.

Канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва нізавымі вытворчымі зьвеньнямі — рашаючая ўмова перавыкананьня плану у гэтых брыгадах. Бюро цэхавай ячэйкі лесапільнага цэху амаль кожную тыдзеньную інструктуе парторгаў, правярае іх работу. Партгрупы перадавых брыгад часта практыкуюць 10-мінутныя нарады зьвёх зьмен, на якіх вылучаюцца ўмовы работы папярэдняй зьмены і прымаюцца сустрэчныя планы. Пераважная колькасьць брыгад пераведзена на індывідуальную і групавую зьдзельную аплату працы.

Зараз пасьля рэмонту старой сушылкі і арганізацыі новых зьвёх сушыльных камэр прастой у механічным і зборачным цэхах ліквідаваны, што забясьпечвае выкананьне вытворчых праграм усіх прадпрыемстваў. Дрэзкапрацоўчы завод мае ўсе магчымасьці для того, каб выйсьці ў рады перадавых прадпрыемстваў БССР.

К-р.

Кіруюць ґабінэтным парадкам

На працягу шэсьці год добрусскай паперовая фабрыка «Герой працы» ня выплаціла з прарыву, незважаючы краіне дзесяткаў тысяч тон паперы.

Зусім дрэнна на фабрыцы расстаўлена партыйная сіла. Досыць паказаць на той факт, што ў брыгадзе па рамонце пад'ёмнікаў (7 чал.) камуністаў 5 чалавек, а ў брыгадзе паравознага дэпо (9 чал.), якое зьяўляецца вузкім месцам фабрыкі, — 1 камуніст. У брыгадзе машыністаў (25 чал.) транспартнага аддзелу няма ніводнага камуніста. Ні адзінага камуніста таксама няма і ў брыгадзе машыраводчыкаў (7 чал.). Ні адна ячэйка ня выключае брыгадам партарганізатараў і партпрыкладаных. Выканаўчая прада сярод рабочых не разгорнута. Есьць адзінкі партыйцаў, але ў яе мала ўцягнута рабочых, дый тыя, пасьпешнае яе не дасягае больш 40-50 проц. Гурток па аўладаньні тэхнікай распаўся, бо выкладчыкі на заняткі не зьяўляюцца. А цяга ў рабочых апрыкаць тэхнічныя веды вялікая. На фабрыцы няма ніводнай гаспадарча - разрахунковай брыгады.

Партком і фабком кіруюць ґабінэтным парадкам: пішуць розныя, бывалы, зле нічо не правяраючы іх выкананьня.

Партком павінен забясьпечыць перабудову работы ўсіх арганізацый фабрыкі на аснове 6 умоў тав. Сталіна.

В. Касьцялевіч.

У рэзультаце конкурсу—17 новых гаспадарча-разрахунковых брыгад

Узор змаганьня за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна дае партарганізацыя фабрыкі «Кастрычнік». Пад лёзунгам завяршэньня чацьвертага году пяцігодкі партарганізацыя правядзіць сярод рабочых прадпрыемства пастановы XVII канфэрэнцыі ўсесаюзнай (б) і XIV зьезду КП(б)Б.

Работыя павышэньнем творчай актыўнасьці адказваюць на пастановы партыі. За лютый прамфінплян выкананы на 101 проц. Перавыкананьню плану спрыяў арганізаваны партыйным камітэтам у мінулы месяц конкурс на лепшую брыгаду, істужку, у які былі ўцягнуты ўсе рабочыя і інжэнэрна-тэхнічныя работнікі. За апошні месяц амаль у два разы павялічылася колькасьць гаспакірча-разрахунковых брыгад. У пачатку студзеня іх было 19, цяпер — 36.

Ініцыятарамі арганізацыі і кіраўнікамі гэтых брыгад зьяўляюцца камуністы. Усе зьмены выкананы ўнутрызмаганьні сустрэчныя планы. Цэх'ячэйкі і партбюро фарміруюць і наладжваюць мерапрыемствы па канкрэтных галінах працы, уключаюць адказасьць на поўных асоб. Значна палепшыліся бытавыя ўмовы работніц (а іх на фабрыцы 60 проц.). У лютым месяцы адкрыты ясьлі на 200 дзяцей. Ясьлі зьяўляюцца першымі ў БССР, у якіх дзеці пагадзяюцца і ўзвень і ночу. Гэта вызначае для работніцы шмат часу і дае ёй магчымасьць культурна расьці, павышаючы тэхнічныя і агульныя веды.

Палепшэньне якасьці партработы на фабрыцы адбываецца побач з ростам партарганізацыі. За лютый рабочымі падана 50 заяў аб уступленьні ў партыю, з іх 46 заяў ад работніц. М.С.

Конкурс спараных брыгад

Старт усебеларускага дан

ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПОСЬПЕХ КОНКУРСУ

Удзельнікі другога ўсебеларускага

10 сакавіка дан старт паравозным брыгадам, якія ўключылі ў 2-гі Усебеларускі конкурс. Вось іх прозьвішчы.

Па дэпо Гомель: брыгады пасажырскіх паравозаў С-112 — машыністаў Дзяніцава і Шульгі, С-303/2 — машыністаў Бродкіна і Самадумава. Брыгады таварных паравозаў Щ-2055 —машыністаў Нічыка і Сакосіка, Щ-4534 — машыністаў Шчаганкова і Лунёва, ОЧ-2 — Праскакова і Леанова (камсамольцы), ОЧ-6761 — Сяпчава і Кір'ячыкава.

Па дэпо Калінкавічы — брыгады таварнага паравозу ОВ-7587 — машыністаў Наварава і Яворава.

Па Жлобінскім дэпо — брыгады таварных паравозаў Щ-1685, машыністаў — Сеняжынскага і Вігдорчыка, Щ-557 — Адыаблюдава і Стацько, Щ-2076 — Драздова і Марохава, Щ-5089 — Руцэвіча і Танькова.

Па дэпо Асіповічы — брыгады таварных паравозаў ОВ-5134 — машыністаў Урбановіча і Алёксы, Ов-6365 — Царыцкага і Саламатнікава.

Па дэпо Магілеў — брыгады таварных паравозаў Щ-482 — Павлова і Марчулеўскага, Щ-348 — Дораша і Антонава.

Па Віцебскім дэпо — брыгады пасажырскіх паравозаў С-101-2 — Паліфана і Бацітанава, С-56 — Паліфана і Шпакоўскага, С-12 — Белякова і Пятрова. Брыгады таварных паравозаў С-44 (камсамольскі) машыністаў Эбарта і Башкова, Э-91 — Шчарбакова і Гулеша, Щ-647 — Кальцова і Конюхава, Щ-419 — Радзько і Авеліяна.

Па дэпо Полацак — брыгады таварных паравозаў ОВ-7259 і Щ1542.

Па дэпо Ворша — брыгады пасажырскіх паравозаў СУ-97-69 — Мікулоўіча і Гускіна, СУ-9874 — Баранава і Карысьціка. Брыгады таварных паравозаў Щ-22 Рыжанскага і Дакукіна, Щ-323 — Янушэўскага і Данулкіна.

Па дэпо Менск — брыгады пасажырскіх паравозаў СУ-9787 — Ветрава і Касько. Брыгады таварных паравозаў Щ-373 — машыністаў Цыліка і Жаўняруча, ОВ-6016 — Купроева і Хмялеўскага.

Вынікі першай пяціднеўкі

ГОМЕЛЬ, 9. (Па тэлефону ад наш. кар.).

За першую пяціднеўку ўдзелу на ўсесаюзным конкурсе паравоз С-52, пад кіраўніцтвам машыністаў Хлеўнікава і Сімакова зрабіў перапрабег на 500 кілёмэтраў, нагон у пуці 75 хвілін, даў эканомі апалу 5,15 тон, зрываў спаранай ня было, сьледаваньне паводле раскладу—100%, астановак у дарозе ня было.

Паравоз ОЧ 4631, машыністаў Сяргеева і Маркава, зрабіў прабег на 959 кіл. замест плянавых 675, нагон у пуці поўнасьцю, даў эканомі апалу 4.51 тон. Сьледаваньне паводле раскладу 100 проц., зрываў спаранай яды і астановак у дарозе ня было.

Паравоз Щ-579, машыністаў Гарбачова і Барташэвіча зрабіў прабег 550 клм. замест плянавых 675, нагон у пуці 7 мінут, мае эканомі апалу 3,04 тон, сьледаваньне паводле раскладу—100 проц., зрываў спаранай і астановак паравозаў ня было.

Паравоз Щ-1610, машыністаў Савіных і Белікі зрабіў прабег 417 кілёмэтраў замест плянавых 700, нагон у пуці 18 мінут, мае эканомі апалу на 25 проц. Усе пункты паказальнікаў умоў канкурсу выкананы.

Паравоз Щ-1523, машыністаў Насеніна і Кажлая, прабег выканаў у 104 кілёмэтры замест плянавых 700, нагон у пуці—53 мінуты, даў эканомі апалу 9 проц., іншыя паказальнікі ўсе выкананы.

Гафт.

Віцебскія ІТР уключылія ў конкурс

Па Віцебскім чыгуначным раёне шырока разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія інжынэрна-тэхнічных сэкцый. Кампанія праходзіць пад кутом поўнага выкананьня і перавыкананьня вымяральнікаў, рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна і загаду тав. Андрэева, забясьпячэньня посьпеху па конкурсе.

Пашыраны пленум раённага бюро ІТС разам з актывам пастанавілі выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва РБ ІТС Ворша па наступных паказальніках:

— Лепшая мабілізацыя інжынэрна-тэхнічных работнікаў па выкананьне і перавыкананьне вымяральнікаў;

— Лепшае правядзеньне тэхпрапаганды, найбольшы ахват тэхвучобай рабочых і ІТР;

— Укараненьне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх зьвеньнях;

— Найбольшы ахват ІТР марксыцка-ленінскай вучобай. Поўнае ўсваеньне пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

— Найбольш актыўны ўдзел ва ўсесаюзным і ўсебеларускім конкурсах спараных брыгад і правядзеньні сталінскага паходу.

Задача ўсіх інжынэрна-тэхнічных работнікаў раёну — забясьпечыць поўнае выкананьне ўзятых абавязацельстваў. VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў павінен быць сустрэты выкананьнем усіх паказальнікаў прамфінпляну.

Н.

„Бальшавіцкі сыгнал" арганізаваў мітынг паравозаў і вагонаў

ВОРША, 9. Раённая чыгуначная газэта «Бальшавіцкі сыгнал» адарвала на сваіх старонках мітынг паравозаў і вагонаў. Мітынг праходзіць пад лёзунгамі «на сьвяцілістычныя транспарце не павінна быць паравозаў, вагонаў і вагітаў—«ультаў»» «у кожнага ўдарніка—паравоз і вагітаў — ударнік», «кожны работы абязаны аўладаць тэхнікай сваёй вытворчасьці».

У першым мітынгу («Б. С» № 11/17) прымалі ўдзел 4 паравозы і 3 вагоны.

— Калі я пападаю ў дэпо Менск, — зазяўляе паравоз СУ-98-73,—мяне стаяць пад адкрытым небам. Чысткі топкі робяць пры адкрытых клапанах пэнадзьвіка і сёфова, што вымагае печу тымацкіных труб. Паравозы ОВ-6153 і 7077 скарэдзяцца на дрэнным вымосьнае да іх з боку сваіх чыгун дарог—паравозных брыгад. Большая частка фідэлёў, паравозных і таварных буксаў адсутнічае.

Вагоны №№ 453820, 470408 і 38373 выдзеляюцца на мітынгу аб тым, што яны амаль месяц стаяць на ёкзыперэнтных шляхох і іх па скарыстоўваюць, тады яны і сушы сдарожна.

Мітынг праходзіць пад кутом барацьбы за паспяховае праведзеньне конкурсу спараных брыгад.

А. ДАБРАВОЛЬСКІ

Хэмічная прамысловасьць БССР у другой пяцігодцы*)

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, працоўныя БССР закончаюць свае першую пяцігодку ў чатыры гады, а па некаторых галінах у яшчэ больш кароткі тэрмін. Калі ў 1928-29 г. удзельная вага прамысловасьці складала 23,6 проц. у адносінах да ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі, дык ужо ў трэцім годзе пяцігодкі яе ўдзельная вага ўзьнімаецца да 53.2 проц. Гаспадарка ў цэлым замяняецца на больш высокую тэхнічную ступень.

Усё гэта ставіць перад другой пяцігодкай задачу яшчэ большага расьвіцьця тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі, узмацненьня вядучай ролі прамысловасьці, заваяваньня рэканструкцыі ўсіх галін гаспадаркі на базе высокай тэхнікі.

У гэтых умовах хэмія і хэмічная прамысловасьць набываюць вялізарнае значэньне. Узьнядзьце гаспадаркі на вышэйшую тэхнічную ступень ня мыслімо без мацнейшага разьвіцьця хэміі—аднаго з асноўных мэтадаў навейшай тэхналёгіі. Максымальнае фарсаваньне хэмічнай прамысловасьці высоўваецца, як адна з важнейшых гаспадарча-палітычных задач другой пяцігодкі.

Трэба адзначыць, што тэмпы разьвіцьця хэмічнай прамысловасьці, якія былі намечаны ў першай пяцігодцы выпоўняцца выкананяцца. Неабходна тут на што-б там ні стала дабіцца карэннага пералому, неабходна «па хэмічнай прамысловасьці поўнасьцю ліквідаваць адставаньне ад тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі ў цэлым» (з рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі). Лёзунг «максымум у 10 год мы павінны прабегчы адлегласьць, на якую мы адсталі ад перадавых краін капіталізму»—у першую чаргу павінен быць ажыцьцёўлен хэмічнай прамысловасьцю.

Якія-ж канкрэтныя задачы ў гэтым напрамку стаяць перад хэмічнай прамысловасьцю БССР у другім пяцігодзьдзі? На гэта пытаньне вычарпальны адказ даюць пастановы XVII канфэрэнцыі ўсеКП(б) і 14-га зьезду КП(б)Б.

«Цэнтральнай задачай другой пяцігодкі павінна стаць рашучае павышэньне ўраджайнасьці калгасных і саўгасных палёў» (з рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі). Паколькі праблема ўраджаю ў значнай ступені зьяўляецца праблемай хэміі, асноўная задача хэмічнай прамысловасьці заключаецца ў падвядзеньні вытворча-тэхнічнай базы пад сальскую гаспадарку.

Паводле намячэньняў НКЗ і НДІ рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, агульная патрэба БССР у 1937 г. у мінеральным угнаеньні складае 1.157 тыс. тон—88 клгр. на гэктар пасеўнай плошчы. Паколькі вялікая гэта лічба, гаворыць той факт, што толькі Галандыя спажывае такую колькасьць штучных угнаеньняў, іншыя-ж краіны, пазат з найбольш інтэнсыўнай сельскай гаспадаркай у гэтых адносінах далёка адстаюць.

У адпаведнасьці з гэтым патрабаваньнем сельскай гаспадаркі, кіруючай ідэяй другой хэмічнай пяцігодкі БССР зьяўляецца выраб мінеральных угнаеньняў, што поўнасьцю адказвае дырэктыве XIV зьезду КП(б)Б. «У мэтах задавальненьня патрэб сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, фарсаваць далейшае разгортваньне хэмічнай прамысловасьці на базе мясцовага сырцу (фасфарыты, даламіты)».

З ліку мінеральных угнаеньняў, выхо дзячы з рэальных крыніц сырцу, мы разьвіваем у БССР выраб фасфарытна-кіслых соляй і азоту.

Сырцовая база нашых фасфарытаў знаходзіцца ў вярхоўі рэкі Сожа; да гэтага часу зьяўлены запасаў у разьмеры каля 10 млн. тон. На гэтай базе намячаецца ў 1933 г. пабудаваць у Крычаве другі магутны фасфарытны завод на 100 тыс. тон фасфарытнай мукі, потым у 1934 г. пачаць будаўніцтва ў Прапойску працэнтнага заводу на 40 тыс. тон і ў 1937 г.—завод складанага угнаеньня—амафоса на 60 тыс. тон.

У цэлым разьвіцьцё вытворчасьці угнаеньняў, якое намячаецца ў БССР у другой пяцігодцы, разам з касьцяной мукай ад Магілёўскага косьціапрацоўчага заводу, дае 15 клгр. спажыўных матэрый на гэктар пасеўнай плошчы.

Другім стрыжанем другой хэмічнай пяцігодкі БССР зьяўляецца хэмізацыя апалавай базы. Паміма выпрацоўкі тарфянога газу, які адначасова зьяўляецца сырцом для сынтэзу аміяка і апалам для прамысловых печаў, хэмія на гэтым вучастку робіць пераварот у адносінах стварэньня ў БССР магутнай базы цяпкага апалу.

Экспэдыцыя, якая працавала ў 1931 г. пад кіраўніцтвам прафэсара М. М. Салаўёва (Акадэмія навук СССР) і інжынэра Ладышэйна (Сланпраект) вывяла ў раёне Віцебск-Асьвея вялізарныя запасы высокакласных сапрапелю. У бягучым 1933 г. інстытут прамысловасьці ставіць вопытную ўстаноўку для перапрацоўкі гэтых сапрапеляў. У пэрспэктыўны плян унесена будаўніцтва ў 1934 г. заводу, разьлічанага на гадавую перапрацоўку 200 тыс. тон сапрапеляў з тым, каб у 1937 г. пашырыць яго да 500 тыс. тон. Гэты завод, апрача пайкокса і газу, дасьць бензін, газ і іншыя вырабы, пажэтальт мазуту.

Значныя запасы даламітаў у БССР высоўваюць пытаньне аб іх выкарыстаньні для атрыманьня магнэзіяльных соляй і ізаляцыйных матар'ялаў. Рад галін прамысловасьці прад'яўляе вялікі попыт на вуглякіслыя магнэзіяльныя солі і на жжоную магнэзію. Яшчэ больш востра стаіць пытаньне аб спадкэньні бурна ўзрастаючай цэлюлёзнай гаспадаркі патрэбнымі ёй ізаляцыйнымі матар'ямі. Тэрмаізаляцыйны матар'ял «савелёт», які выпрацоўвае завод «Чырвоны хэмік» у Новабеліцы, зьяўляецца адным з лепшых з існуючых відаў тэрмаізаляцыі. Паводле пэрспэктыўнага пляну на другое пяцігодзьдзе мяркуецца абсталяваць на заводзе «Чырвоны хэмік» вытворчасьць магнэзіяльных соляй і пабудаваць магутны камбінат у Крычаве на 10 тыс. тон тэрмаізаляцыі, 2.000 тон магнэзіі «альба» і 1.000 тон магнэзіі «ўста».

Выкарыстаньне іншых відаў мінеральных багацьцяў БССР у 2-м пяцігодзьдзі пойдзе на лініі будаўніцтва заводу на перапрацоўцы флёрыдзінавых глін на 20 тыс. тон, пабудовы буйнага заводу плаўленай кроймы на 15 тыс. тон і разьвіцьця ляка-фарбавай прамысловасьці.

Па ляка-фарбавай прамысловасьці намячаецца пабудаваць буйны завод з выпрацоўцы тарфянай сажы тыпу «торфель» на 12 тыс. тон, ляка-фарбавы камбінат у складзе цэхаў: вапняных каляровых фарбаў, цёртых, сіківатных, казеінавых, фарбаў, аліфы «Павель» і лякапалітуры. Умоўна ўключана ў плян пабудова заводу па выпрацоўцы жалезнага сурыка і каўчуканных агаркаў серкава-кіслотнай вытворчасьці. Гэты завод уносіцца ўмоўна, бо ў выпадку ажыцьцяўленьня ў БССР будаўніцтва мэталюргічнага заводу, калчуканныя агаркі могуць быць перададзены гэтаму заводу для ўзмацненьня яго сырцовай базы. Праз хэмію вядзе тут шлях да пашырэньня сырцовай базы цяжкай прамысловасьці.

Дырэктывы XVII партканфэрэнцыі аб «стварэньні навейшай тэхнічнай базы для ўсіх галін народнай гаспадаркі» знаходзіць яркі адбітак у пэрспэктыўным плане арганізацыі вытворчасьці пластычных мас. На базе каазіну і бялковых адкідаў гарбарнай вытворчасьці намячаецца будаўніцтва галалітавага заводу; шляхам канденсацыі фанолу і крэзолаў, будуць выпрацоўвацца пластычныя матэрыі, тыпу бакеліта. Ня прыходзіцца ўказваць, якое вялізарнае значэньне ў сучаснай тэхніцы набываюць штучныя пластычныя матэрыі. У раёне галін пластычных масы замяняюць дэфыцытныя каляровыя металі, аслабляюць нас ад імпарту раду матар'ялаў і гэтым узмацняюць нашу эканамічную незалежнасьць ад капіталістычных краін.

Ня меншае значэньне мае разьвіцьцё ў другім пяцігодзьдзі вырабу раст варыцеляў. Тут, апрача пашырэньня Быхаўскага алэтопа-буцілавага заводу, якое заканчваецца ў бягучым годзе, і арганізацыі пры ім цэху па выпрацоўцы мэтаналу з алыкодзячых газаў, за праектавана ваду будаўніцтва двух буйных алэтопа-буцілавых і адзнаго мэтаналазнага заводаў. Гэта будаўніцтва ажыцьцяўляецца на базе такога сырцу, як бульба, на выробу якой БССР зьяўляецца адным з багацейшых раёнаў. Даволі ўказаць, што згодна намячэньняў НКЗ і інстытуту рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, БССР па вырабе бульбы да канца другога пяцігодзьдзя будзе стаяць упераадзе ўсіх капіталістычных краін, за выключэньнем Германіі, і яе працуючым насьнне амаль палова вытворчасьці ўсёй дакалешняй Расіі.

Выкарыстаньне водных рэсурсаў БССР знаходзіць у пэрспэктыўным пляне разьвіцьця хэмічнай прамысловасьці свой адбітак у выглядзе будаўніцтва двух электра-хэмічных заводаў.

Тут мы дасягаем аб'яднаньня дзьвюх кіруючых галін перадавой тэхнікі—электрычнасьці і хэміі, узьнімаем вытворчасьць на вышэйшую тэхнічную ступень.

***

Такім чынам, памётка другой хэмічнай пяцігодкі БССР выходзіць з асноўных напрамкаў, па якіх разгортваецца будаўніцтва сацыялізму ў Савецкім Саюзе. Торф, сапрапель, рад іншых нарудных выкапняў, бульбяны сырэц, у некаторай ступені гідраэнэргетычныя рэсурсы—вось тыя прыродныя багацьці, што надаюць БССР пэўны эканамічны твар, які вызначаюць яе месца ў радзе раёнаў і рэспублік Саюзу.

Геаграфічныя пункты размяшчэньня асобных вытворчасьцяй падводзяць базу пад спэцыялізацыю асобных раёнаў і ўнутры БССР.

На поўначы—у раёне Віцебску разь

Усебеларускі агра-тэхнічны зьезд

Правільна арганізаванай працай, у спалучэньні з перадавой агра-тэхнікай, наступаць на ўсіх вучастках барацьбы за ўраджай

З дакладу народнага камісара зямляробства БССР тав. Рачыцкага

Апыраючыся на сягашнія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, тав. Рачыцкі перайшоў да характарыстыкі задач, якія стаяць перад намі ў галіне барацьбы за ўзьняцьце ўраджайнасьці.

У чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі мы павінны давесьці пасеўную плошчу па БССР да 4.150 тыс. га супроць 3.560 тыс. у 1931 годзе. На долю сацыялістычнага сэктару будзе прыпадаць больш 60 проц. пасеўнай плошчы.

Мы павінны ў гэтым годзе дабіцца ўраджаю па збожжавых у сярэднім ня менш 9,1 цэнт. з аднаго га, па ільне — 2,6 цэнт. валакна з га, канапель — 4.1 і бульбы 110,7 цэнт.

Стала буйнай рагатай жывёлы неабходна папырыць на 17 проц. і сьвіней — на 40 проц., удойнасьць кароў у саўгасах усынаць у сярэднім на 1.400-1.500 літраў у год і ў калгасах на 1.200-1.300 літраў.

Каб выканаць гэты план сельска-гаспадарчай вытворчасьці ў чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі, зацьверджаным урадам БССР і ўхвалены ЦК КП(б)Б, мы павінны за што-б там ні стала ўзьняць ураджайнасьць сацыялістычных палёў. Гэта асноўная задача ўсёй грамадзкасьці і ў першую чаргу ўсе рабоцікаў, сельскай гаспадаркі.

Першай умовай для яе выкананьня зьяўляецца ўвядзеньне правільных севазваротаў. Народны Камісарыят зямляробства сумесна з інстытутам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі імя Леніна распрацаваны севазвароты для саўгасаў і калгасаў, якія ўжо апублікованы ў друку. Але гэта толькі пачатак работы, галоўнае — умець пастасаваць іх у жыцьці. Апублікаваныя севазвароты не зьяўляюцца канчатковымі, у тэй ці іншай частцы магчымы паправкі, карэктывы, для чаго мы іх і вынесьлі на шырокае абгаварэньне.

Але адно ясна, ужо ўвесну 1932 году мы павінны рашуча ўзяцца за ўвядзеньне севазваротаў у калгасах і саўгасах, з тым, каб у 1933 годзе гэта работа ў асноўным была закончана. Севазвароты павінны быць арэзумены шырокай масе калгаснікаў, па магчымасьці з меншай колькасьцю палёў і адказваць запатрабаваньням вытворчых планаў кожнай гаспадаркі.

Другой, ня менш важнай умовай узьняцьця ўраджайнасьці зьяўляюцца такія мерапрыемствы, як якасьць апрацоўкі глебы, заблеванае поўрыва, якасьць насеньня, тэрміны сяўбы, догляд за ўраджаем, барацьба са шкоднікамі.

Трэба дабіцца такога становішча, каб апрацоўку глебы весьці культурна ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі агранамічнай навукі.

Сяўбу яравых, асабліва вядучых культур правесьці выключна на зябі. У залежнасьці ад кліматычных умоў і вегетацыйнага перыяду пасобных культур,—выкначыць цывёрныя тэрміны пачатку і канца сяўбы. Нельга дапускаць такога становішча, калі мы запазняемся сяўбу да ліпеня і готым па-першае ўпускаем найбольш спрыяючы час для росту расьлін, па другое провесьлі уборку глыбокай восеньню ў перыяд дажджоў і прымаразкаў. Выключнае значэньне мае і ахаладжка — толькі пры выкананьні гэтых мерапрыемстваў мы дасягнем перамогі.

Важнейшай умовай для ўзьняцьця ўраджайнасьці і прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі—зьяўляецца ўкараненьне агратэхнікі, аўладаньне ёю шырокімі калгаснымі масамі і рабочымі саўгасаў і МТС.

Масавая агратэхнічная праверка зараз абавязкова для кожнага спэцыяліста, дзе-б ён ні працаваў. Побач з арганізацыяй курсаў трэба пакласьці

Прафэсар Крыловаў

усю рэспубліку гурткамі па вывучэньні агратэхнікі. Такі гурток павінен быць у кожным саўгасе і калгасе. У больш буйных саўгасах мы павінны ўзяць курс на тое, каб ператварыць гурткі па вывучэньні агратэхнікі ў вячэрнія школы.

Выключную ўвагу трэба зьвярнуць на замацаваньне калгаснай брыгады — асноўнае зьвяно калгаснай вытворчасьці, на выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб замацаваньні за брыгадай пастаяннага вытворчага вучастку на ўвесь год пяцігодкі ацэнкі прадукцыі брыгады ў залежнасьці ад атрыманага ўраджаю. Калгасы аснуў у твары лепшых вытворцаў і брыгадзіраў павінен стаць энтузіястам барацьбы за ўраджай, энтузіястам рэканструкцыі калгаснай вытворчасьці на вышэйшай тэхнічнай аснове.

Наступаць на класавага ворага

Правяраючыя дырэктывы партыі па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі сустрэлі супраціўленьне клясавага ворага, кулацтва і яго апартуністычнай агентуры, якія будуць імкнуцца перашкодзіць зрэнтаваньню - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Задача ўсіх спэцыялістаў сельскай гаспадаркі — мабілізавацца на рашучую барацьбу з клясовым ворагам.

Спэцыялісты, якія ўжо на справе павялі адпаведную партыі і палалі яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам будуць весьці рашучую барацьбу па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і аддадуць свае веды на будаўніцтва сацыялізму ў краіне саветаў.

Перадавікі с.-г. вытворчасьці

Трэцяя бальшавіцкая вясна павінна прайсьці пад знакам барацьбы за ўкараненьне севазваротаў, за высокую якасьць апрацоўкі глебы і належны догляд за пасевамі. Ужываньне гэтых мерапрыемстваў забясьпечвае ня толькі выкананьне але і перавыкананьне заданьняў партыі і ўраду.

Аб тым, наколькі гэтыя планы рэальны сьведчаць дасягненьні лепшых саўгасаў і калгасаў, у якіх ураджай ужо ў 1931 годзе быў значна вышэй ўраджаю, які мы пажнулі ў 1932 годзе. Гэтыя гаспадаркі знаходзяцца ў БССР у такіх-жа кліматычных і глебавых умовах, як і ўсе іншыя. Там працуюць тыя-ж самыя людзі, але значна культурней, прытрымліваюцца агранамічных правіл. Вось гэтыя гаспадаркі:

Калгас «Прагрэс», Лёзнінскага раёну, меў у 1931 годзе з аднаго га 4,1 цэнт. ільну, калгас «Новы шлях», Шклоўскага раёну, меў 3,1 цэнт. пры сярэднім ураджаі ў 2 цэнт.

Саўгас «Прылукі» меў у мінулым годзе 150 цэнт. бульбы з аднаго га, саўгас «Пятроліна» — 133,5 цэнт. калгас «За ўраджай», Асіпавіцкага раёну—178 цэнт., калгас «Сюм» — 157 цэнт. і калгас «Камунар» (Чырвона-Слабодзкі раён — 117,3 цэнт.), пры сярэднім ураджаі па БССР у 90 цэнт.

Саўгас «Блень» меў 16,8 цэнт. жыта з га, саўгас «Бацэвічы» — 13 цэнт. калгас «Прагрэс» — 13,2 цэнт. і калгас «Зара» — 11,8 цэнт. пры сярэднім ураджаі па БССР каля 7 цэнт.

Наша задача на сёньняшні дзень раўняцца па гэтых перадавых гаспадарках, вучыцца пераносіць іх вопыт у адстаючыя.

Выкананьне плану ўзьняцьця ўраджайнасьці дасьць нам дадаткова супроць 1931 году 6.800 тыс. цэнт. збожжавых культур, 175 тыс. цэнт. ільну, 113 тыс. цэнт. канапель і 26 млн. цэнт. бульбы.

Як бачым, ёсьць за што змагацца.

Спыняючыся на пытаньнях разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі тав. Рачыцкі падкрэсьлівае, што ў гэтым годзе мы павінны залавіць ня менш 405 тыс. цэнт.

Бесгаспадарчасьць, абязьлічка, брод па жывёлагадоўчых фэрмах саўгасаў і калгасаў зьяўляюцца асноўнымі пры чымкі вялікага адыходу жывёлы, асабліва парасят. На гэтым важнейшым вучастку мы яшчэ як сьлед не арганізавалі працы, не паставілі на скотных дварох лепшых калгаснікаў і рабочых саўгасаў, не зацікавілі іх матар'яльна.

Падабраць і замацаваць на гэтай рабоце лепшых людзей, ліквідаваць абязьлічку і ўрачыстаўку, узяць пад штодзенны і пільны нагляд злучку, запросы і ацёлы, палепшыць догляд

Несьцяровіч (Белару ская бульбяная станцыя)

Узьняць ураджайнасьць бульбы

Я спынюся на асноўных мерапрыемствах па ўзьняцьці ўраджайнасьці адной з вядучых культур сельскай гаспадаркі БССР — бульбы. У балянсе сельска-гаспадарчай вытворчасьці Беларусі бульба адыгрывае значную ролю. Прыкладна, на карміленьне жывёлы скарыстоўваецца ад 37 да 40 проц., на харчовыя патрэбы насельніцтва — да 31 проц., на перапрацоўку — 5-6 проц. Пасеўная плошча пад бульбай у параўнаньні з даваеннымі часам узрасла прыкладна на 56 проц., у той час, як ураджайнасьць узрасла на 16 проц. Як відаць, ураджайнасьць дагэтуль адставала ад росту пасеўнай плошчы.

Сярэдняя ўраджайнасьць бульбы па саўгасах і калгасах за апошнія тры гады складала прыкладна 97 цэнт. з га. Гэта паказвае, што мы яшчэ ня здолелі скарыстаць усіх пераваг сацыялістычнай сыстэмы гаспадараньня.

У 1932 г. мы павінны атрымаць да 8 млн. тон бульбы на плошчы ў 700 тыс. га. Ураджайнасьць трэба ўзьняць на 20 проц., г. зн. атрымаць ня менш 116 цэнт. з га.

Для ўзьняцьця ўраджайнасьці бульбы трэба ўвесьці правільныя севазвароты, у якіх павінны быць пазітыўныя травы.

Высокі ўраджай бульбы атрымліваецца пры ўжываньні гною, прыдост ураджаю — на 60-100 проц. У нашых умовах асобліва вялікае значэньне мае такое ўгнаеньне, як торф, ужыты сумесна з гноем. Напрыклад, 75 проц. торфу і 25 проц. гною значна павялічваюць ураджай бульбы. Ужываньне вялікага вялікае павялічвае ўраджай да 12-20 проц.

Пасадку бульбы трэба праводзіць сумесна з раньнімі яравымі на працягу 15 дзён, не пазьней 15 мая. Вялікае значэньне мае свячасовая ўборка. Страты ад несвячасовай уборкі часта дасягаюць ад 10 да 20 проц.

Ня менш важным мерапрыемствам па ўзьняцьці ўраджайнасьці бульбы зьяўляецца ўжываньне чыста-гатунковага насеньня. Ужо ў гэтым годзе мы павінны засеяць да 10 тыс. га гатунковым насеньнем бульбы.

Бэрзін (Занальная станцыя)

Ужываньне тарфянога падсьцілу
вырашыць праблему азотнага угнаеньне

Наша глеба патрабуе шмат азоту. Без забясьпячэньня глеб азотам нам цяжка будзе ўзьняць ураджайнасьць.

Якія-ж мы маем перспэктывы? Спадзяваецца на тое, што ў бліжэйшыя гады мы будзем поўнасьцю забясьпечаны азотнымі і мінэральным угнаеньнямі нельга, бо ў нас толькі зараз арганізуецца азотная прамысловасьць, ды і так пытаньне ня ставіцца. Напрыклад, у Германіі патрэбы азоту на адну трэцюю частку забясьпечваюцца праз гной і толькі адна шостая частка забясьпечваецца азотна-мінэральным угнаеньнем. Нам таксама трэба пайсьці па такім шляху.

Па прыблізных падліках мы маем па БССР каля 20 млн. тон гною. Гэта колькасьць ня можа нас зараз задаволіць. Яна павінна быць значна павялічана.

Каб вырашыць азотную праблему, нам патрэбна ў максымальнай колькасьці забясьпечыць нашу гаспадарку падсьцілкам. Гэта дасьць вялікую карысьць для нашай жывёлы і з другога боку дасьць шмат азоту.

Які падсьціл нам трэба ўводзіць? Лічу, што ў нашых умовах трэба як мага больш скарыстаць у якасьці падсьцілу торф. Тарфяны падсьціл мы можам лёгка падрыхтаваць.

Архіпенка—калгас імя Калін на, Рагачоўскага раёну)

Да сяўбы падрыхтаваны

Наш калгас добра падрыхтаваўся да пасеўнай кампаніі. План веснавой сяўбы нашы абмяркоўваў дэтальна. Калгасам высунут сустрэчны плян па тэхкультурах — па ільне — на 4 га, па гароху — на 2 га. Насеньны і страхавы фонды ўжо ссыпаны. Усё насеньне ачышчана. Інвэнтар, збруя і калёсы адрамантаваны. Нашы коні ў добрым стане. На час палявых работ забраніяваны фуражны фонд. Вызначаны па пляне 25 тон угнаеньня ўжо завезены.

Для будаўніцтва цялятнікаў, стайні і сьвінарніка вывезена 450 кбм. лесматар'ялу.

Дзякуючы ажыцьцяўленьню 6 умоў тав. Сталіна, мы яшчэ восеньню дабіліся значных посьпехаў па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы. У нас 12 жанчын выбіралі на працягу дня 1 гэктар бульбы.

Для падрыхтоўкі кадраў мы накіравалі на розныя курсы 9 чалавек.

Дзеньнік зьезду

Усё пасяджэньне 9 сакавіка было прысьвечана пытаньням разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. З суладкладамі выступілі т. т. Бондар і Аўчыньнікаў.

Дэлегаты, якія выступілі ў спрэчках, падкрэсьлілі, што будаўніцтва буйных сацыялістычных жывёлагадоўчых гаспадарак зьяўляецца адзіным правільным шляхам для вырашэньня мясной праблемы.

Тав. Лінэвіч падкрэсьліваў, што далейшае разьвіцьцё жывёлагадоўлі ўпіраецца ў кармовую базу. Недахват кормоў адчуваецца ўжо ў гэтым годзе. Ужо растаючае з кожным годам стала будзе прад'яўляць усё большыя запатрабаваньні да кармовай базы. Каб павялічыць нашу кармовую базу, мы павінны з году ў год асушаць забалочаную плошчу ў 2.660 тысяч га і ператвараць яе ў культурныя палі, заселяць высока якаснымі кармовымі травамі. Для гэтага нашы маліярацыйныя работы трэба перавесьці на новую тэхніку.

Тав. Новікава спыняецца на тым, што ўлік самае слабае месца ў рабоце саўгасаў. Сабекошт сьвіні, як правіла, відомы толькі ў канцы году.

У канцы пасяджэньня з заключным словам выступіў нам. Наркамзему БССР т. Масюкоў.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў даклад т. Карпакевіча і суладклад інжынэра Захарэнка аб мэханізацыі сельскай гаспадаркі.

10 з раньня працавалі сэкцыі зьезду.

Д. ЗАХАРАВА

За савецкую культурную ашчадкасу

З пасьлядняй гадзіны усё большую і большую ўдзельную вагу ў фінансавым сацыялістычнага будаўніцтва набывае мабілізацыя ашчадкасьцяй.

Вялізарны рост даходаў працоўных мас Савецкага Саюзу (43,6 мільярдаў рублёў у 1931 годзе супроць 31,4 мільярдаў у 1930 г.), бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці, вялізныя посьпехі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў адарываюць вялізарныя перспэктывы ў галіне ўзьняцьця сродкаў насельніцтва ў рэчышча фінансаваньня сацыялістычнай будоўлі.

Асноўнай зброяй мабілізацыі сродкаў зьяўляецца сыстэма ашчадкас і дзяржкрэдыту, якая ахапіла дзьць кроіне звыш 3 млрд. руб.

Ашчадкасы БССР дабіліся значных посьпехаў у выкананьні фінансавага плану чацьвертага кварталу мінулага году. Заданьне па ўкладах выканана на 331,6 проц., па кнізьцы — на 113,6 проц. (корац). Значна ўрасла на працягу 1931 г. і сетка ашчадкас, якая на 1 студзеня 1932 г. налічвае больш 1.600 кас. Паказаныя посьпехі дазваляюць, дзякуючы пайкільнаму росту набраньту працоўных мас, дзякуючы разгорнаньню шырокай масавай-растлумачальнай работы вакол рэалізацыі базавых лёзунгаў фінансавага фронту.

Аднак, пасьпяхі не заканчаны. Аб гэтым сьведчыць невыкананьне ашчадкасамі фінплану першага кварталу 1932 г. Плятуцца ў асноўным Расонскі раён, які на 20 дзёнага выканаў 3,9 проц. заданьня па паступленьнях па кнізьцы, Чырвонаслабодзкі, які даў 10,5 проц., Парыцкі—18,2 проц., Нараблінскі — 9,3 проц., Карэлічскі—15,9 проц., Клічаўскі—15,4 проц. і Бешанковіцкі — 19,3 проц. У розных раёнах, з-за адсутнасьці масавай работы ашчадпрацаўніка, пасьпяхі ашчадкасаў і дзяржкрэдытам лесарубаў. Генэральны дагавор аб разгортваньні ашчадпрацы на лесазагатоўках, як і дадатаўр, заключаны ЦК саюзам лесарэчрабочых аб абтрэбаўцы ўкладаў на выкананьне. Апарат ашчадкас, мясцовыя органы Лесбелу, прафсаюзныя арганізацыі і камісіі сацзабесьпячэньня пенсіяны неабходна забясьпечыць поўнае абслугоўваньне лесаруба ашчадкасай непасрэдна на месцы яго работы—у лесе, бараку, інтэрнаце і лесарубкай брыгадзе. Шлях да гэтага —арганізацыя ў лесапункцкіх ашчадкас, на ўсіх лесных вучастках—лесніцкі сацзабесьпячэньні, у чырвоных пунктах і інтэрнатах—гутку па ашчадпрацы а дзяржкрэдыце. Пікетыраньні і пасьцігаваньні на лесазагатоўках абавязаны сьцвердзіць асьвятлець працу ашчадкас, абабіраючы вакол іх увагу прамысловасьці.

Вялізны вялікай фушцыяй ашчадкас зьяўляецца таксама касава-разьліковае абслугоўваньне калгасаў і частковa сельсавецкіх бюджэтаў.

Барацьба за выкананьне фінплану стаіць перад усёй фінансавай сыстэмай і ў прыватнасьці перад ашчадкасатрамі БССР, заклту ўзмацненьнем кампрэтніка кіраўніцтва, узмацненьнем правэрні выкананьня.

У тэкнай ашчадкасе неабходна вылучыць адпаведна за праверку выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па ашчадправе і дзяржкрэдыце. «Без забесьпячэньня на справе праверкі выкананьня і кампрэтнага кіраўніцтва, нельга па-сапраўднаму разгарнуць фронт барацьбы за выкананьне цэнтральных задач народна-гаспадарчага плану, — за скарачэньне пяцігодкі ў чатыры гады» (Молатаў).

Ня глядзячы на тое, што ёсьць рад пастаноў аб узмацненьні кантролі фінансава-крэдытнага апарату гэтыя дырэктывы на месцах ня выконваюцца. У шматлікіх раёнах не хапае заклікаў, інструктароў, бухгальтароў і работнікаў сельскіх кас. У разе месц штат укамплектоўна неадпаўнымі да працы таварышамі. Часта робіцца перакідваньні ў Барысаўшчыне, паўрыдаці, на працягу году сыстаматычна сьпіхаліся загатчыкі райкасы. У Ельскім раёне загатчык райкасы пераходзіў на пасаду загатчыка гарпасу, у Нарэўлянскім загатчык ашчадкасы пераведзен на работу ў лесарабкоп і г. д.

Зараз асабліва ў сувязі з перавачай фондавых апаратаў з банку ў сыстэму ашчадкас, пытаньне ўзмацненьня апошніх кадрамі яшчэ больш усклыпіцца. Пры правяраньні ўдар пагта месяцніка па ашчадправе неабходна ўсім раённым арганізацыям заняцца ўкамплектаваньнем штату райашчадкас здольнымі, аўтарытэтнымі працаўнікамі, якія змогуць-б стаць сапраўднымі арганізатарамі масавых зьбераксакрэтаў, асабліва за лік камсамольскай і калгаснай моладзі.

У ашчадпрацы з апошняй пастановай калегіі НКФ СССР, у прастыку ўводзіцца заключэньне ашчадкасамі дагавораў з пасобнымі калгасамі аб выдачынні з асарэдзіча актывістаў-калгаснікаў—работнікаў для ашчадкас.

Для мабілізацыі актывізацыі дзейнасьці ашчадкас, вылучэньня лепшых узораў працы—абвешчан усесаюзны конкурс на лепшую ашчадкасу. Лепшыя будуць ліквідаваны тыя касы, якія пакажуць прыклады мясазвальтычнай работы. Для прасьпяваньня лепшых ашчадкас БССР выканачай фонд аплаты 7.000 руб.

Прадпрыемкоў ашчадкас неабходна абавязкова прымацаваць за пасобных прадпрыемстваў, калгасаў, сайгасаў для пастаяннага іх абслугоўваньня і арганізацыі масавай работы.

Камсамолу—шэфу ашчадкас — неабходна пасьпяхала ўключыцца ў месяцнік. Абавязак мясцовых органаў саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў—заварыць апарат тварам да работы ашчадкас.

Вось кароткі пералік тых задач, выкананьне якіх забясьпечвае ажыцьцяўленьне плану мабілізацыі сродкаў праз ашчадпрацы БССР.

Месячнік дарожнага будаўніцтва

ДРЫСЕНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ШТУРМАВОЕ ЗАДАНЬНЕ

Лепельскі і Віцебскі раёны—у абозе барацьбы за добрую дарогу

Плян павінен быць выканан

Добрая дарога зьяўляецца адной з важнейшых умоў пасьпяховага выкананьня народна-гаспадарчага плану. Пра гэта нельга забываць ні на адну хвіліну. На жаль, рад арганізацый рашаючых у дарожным будаўніцтве раёнаў, не ўявілі сабе гэтага. Ні пастанова XVII партканфэрэнцыі аб фарсаваным разьвіцьці тэмпаў дарожнага і шасэйнага будаўніцтва, ні пастанова ЦК КП(б)Б аб месячніку дапамогі дарожнаму будаўніцтву не знайшлі практычнага праламленьня ў рабоце Менскага, Віцебскага, Лепельскага, Полацкага і раду другіх раёнаў. Аб гэтым сьведчыць зусім нізкі процант выкананьня штурмавых заданьняў месячніка па гэтых раёнах. З самага пачатку месячніка ні на былі ўзяты належныя тэмпы, ня было праведзена ніякай палітычна-масавай работы вакол дырэктыў партыі аб дарожным будаўніцтве, няма націску на кулацка-заможную частку вёскі выканаць цьвёрдыя заданьні.

У выніку, Менскі раён замест 2.519 фурманак штодзённа, дае 114, Віцебскі замест 650, дае 68, Лепельскі замест 1.805, дае 168 і г. д.

Плян вывазкі каменю ў 4-й пяцідзён ны выканан на 31 проц. і гравія на 9,03 проц. Штурмавое заданьне на 5-III выканана па камню на 11,61 проц., гравія на 4,78 проц., пяску на 3,61 проц., а лесу на 10,68 проц.

Прычынай такіх тэмпаў зьяўляецца адсутнасьць належнай увагі да дарожнага будаўніцтва з боку раду партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый.

Адсутнасьць агітацыйнага кіраўніцтва з боку дарожных арганізацый і невыстарчальнае скарыстаньне ўласнага як аўта, так і гужтранспарту, таксама перашкаджаюць доту работ па заготоўцы і вывазцы дарбудматар'ялаў.

Невыстарчальнае выкананьне агульных вытворчых планаў не зьяўляецца ні ў якім разе довадам верагальнасьці выкананьня плянаў. Гэт. даказана перадавымі раёнамі, сельсаветамі і пасобнымі калгасамі, якія выканалі свае заданьні. Дрысенскі раён, разгарнуўшы шырокую палітычна-масавую работу вакол месячніка, мабілізаваў грамадзкасьць навакол дырэктыў партыі і ўраду па дарожным будаўніцтве. Вынік гэтага бліскучы. За першыя чатыры пяцідзённі месячніка раёнам штурмавое заданьне выканана на 92 проц. Прыклад Дрысенскага раёну павінен быць перанят усімі раёнамі БССР.

Плян поўнасьцю рэальны.

Астатнія дні месячніка павінны быць скарыстаны ўсімі арганізацыямі для бальшавіцкага фарсаваньня тэмпаў загатоўкі і вывазкі дарбудматар'ялаў, для поўнага выкананьня плану месячніка.

Уступаюць у спаборніцтва

ПОЛАЦАК. (Наш. кар.).

Калгаснікі калгасу «Усходы Леніна», Саланіцкага сельсавету, атрымаўшы заданьне — да 1 красавіка 1932 году вывезьці 1.500 кбм. каменю, высунулі сустрэчны плян у 1.550 кбм. і абавязаліся выканаць заданьне не пазьней 25 сакавіка. Калгаснікі зьвярнуліся да ўсіх калгасаў Полацкага раёну падтрымаць іх ініцыятыву і выклікалі на сацспаборніцтва калгасы Расонскага раёну.

Калгаснікі калгасу «Кастрычнік», Замшанскага сельсавету, прынялі выклік і абавяцілі сябе ўдарнікамі месячніка. У пастанове іх гаворыцца:

«Ухваляем пачынаньне калгаснікаў «Усходы Леніна» і высоўваем свой сустрэчны плян па вывазцы каменю і гравія. Абавязваемся штодзённа высылаць не 15, а 30 фурманак, і да 25 сакавіка (раней тэрміну на 5 дзён) вывезьці не 700, а 900 кбм.

Для гэтага складаем 6 ударных брыгад, з якіх адна кіруе пад кіраўніцтвам брыгадзіра калгаснікі-ўдарніцы КУПРЫЯНКІ ХВЯДОРЫ.

Выклікаем на сацспаборніцтва калгаснікаў Расонскага раёну, а таксама калгас «Земляроб», Замшанскага сельсавету.

Астройка.

Раўняйцеся па перадавых

Перадавыя сельсаветы Магілёўскага раёну — Машынацкі, Мастоцкі, Тараноўскі, Сьвежынкі, Новасёлкаўскі поўнасьцю выканалі плян вывазкі дарбудматар'ялаў. Яны дабіліся гэтай перамогі дзякуючы шырокай растлумачальнай рабоце вакол месячніка дакладнай дарожнаму будаўніцтву і шырокаму скарыстаньню аўтагужтранспарту, якія паказалі прыклады мясазвальтычнай работы. Для прасьпяваньня лепшых ашчадкас БССР выканачай фонд аплаты 7.000 руб.

Прадпрыемкоў ашчадкас неабходна абавязкова прымацаваць за пасобных прадпрыемстваў, калгасаў, сайгасаў для пастаяннага іх абслугоўваньня і арганізацыі масавай работы.

Камсамолу—шэфу ашчадкас — неабходна пасьпяхала ўключыцца ў месяцнік. Абавязак мясцовых органаў саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў—заварыць апарат тварам да работы ашчадкас.

Вось кароткі пералік тых задач, выкананьне якіх забясьпечвае ажыцьцяўленьне плану мабілізацыі сродкаў праз ашчадпрацы БССР.

станцыю сацыялістычных мэтадаў працы — спаборніцтва і ўдарніцтва.

Аляротны малюнак паюць гранінёўскі, Слабодзкі і Кляжыцкі сельсаветы. У гэтых сельсаветах у выніку поўнай адсутнасьці масавай работы і націску з боку сельсаветаў ня кулацка - заможную частку вёскі на вывезена ніводнага кубамэтра каменю.

ФРЫД.

Першая пяцідзённка сакавіка не дала павышэньня тэмпаў у лесавывазцы

Скарыстаць кожны дзень сэннай дарогі

Зрух яшчэ не дасягнут

Першая пяцідзённка сакавіка, у параўнаньні з апошняй пяцідзённкай лютага ня прынесла ніякага зруху ў лесавывазцы. Наадварот у вывазцы дзелавой драўніны ёсьць значнае зьніжэньне тэмпаў. Калі за апошнюю пяцідзённку лютага прырост склаў 8 проц., дык за першую пяцідзённку сакавіка толькі—4,6 проц.

Паводле даных Лесбелу на 5-га сакавіка квартальнае заданьне па вывазцы лесматар'ялу выканана на 56,2 проц., па вывазцы дроў на 62,8 проц. Такім чынам, ня гледзячы на самыя жорсткія дырэктывы партыі і ўраду аб максымальным павышэньні тэмпаў лесавывазкі, апошнія ўсё яшчэ застаюцца незадавальняючымі.

Значная частка лесапрамгасаў значна пагоршылі работу. Так, калі Бабруйскі лесапрамгас у апошнюю пяцідзённку лютага вывез 36.043 кбм. дроў і лесу, дык у першую пяцідзённку сакавіка толькі 17.277 кбм., Быхаўскі адпаведна 21.419 і 13.088 кбм. Такое-ж прыблізна зьніжэньне далі Гомельскі, Барысаўскі і Чаўскі лесапрамгасы. Добрых вынікаў у вывазцы за першую пяцідзённку сакавіка дабіўся Лельчыцкі лесапрамгас, які вывез у два разы больш, чым у апошнюю пяцідзённку лютага.

Такое становішча з лесавывазкай патрабуе ад партыйных арганізацый усіх раёнаў, асабліва адстаючых, максымальнага павышэньня тэмпаў, каб у дзьве дзелы сакавіка, якія яшчэ засталіся, поўнасьцю навярстаць упушчанае і з посьпехам выканаць квартальнае заданьне.

Зводка лесазагатовак і вывазкі на 5-га сакавіка 1932 г. па асноўных лесапрамгасах БССР

Назва лесапрамгасу	Загатоўлена: Лесматар'ялу	Загатоўлена: Дроў	Вывезена: Лесматар.	Вывезена: Дроў
	У процантах да квартальнага заданьня			
Лельчыцкі	76,0	98,4	59,2	216,8
Барысаўскі	90,0	99,2	62,6	88,6
Бярэзінскі	98,6	68,7	63,7	85,6
Рэчыцкі	110,4	70,2	73,5	74,3
Сіроцінскі	44,8	75,9	30,9	87,2
Чэрвеньскі	86,2	130,2	60,4	61,2
Горацкі	98,4	60,6	61,7	61,1
Гомельскі	120,6	82,4	57,2	70,1
Бабруйскі	100,5	74,4	55,7	58,0
Лепельскі	91,0	83,9	50,2	51,5
Быхаўскі	72,4	69,6	44,8	62,2
Асіпавіцкі	110,3	77,8	53,7	50,5
Парыцкі	85,6	67,3	42,8	52,4
Менскі	70,5	59,2	32,1	37,1
Чаўскі	91,1	65,6	52,9	45,2
Глускі	87,7	111,4	48,7	45,0
Слуцкі	65,5	140,4	55,7	71,6
Мазырскі	58,8	56,9	54,5	46,4

Дагавары на паперы

Асіповіцкі лесапрамгас, які зьяўляецца адным з асноўных лесапрамгасаў у БССР, вельмі марудна выконвае свой плян па лесавывазцы. Так, на 1 сакавіка квартальнае заданьне па вывазцы дзелавой драўніны выканана на 47,3 проц., па вывазцы дроў — на 43,7 проц.

Цэлы рад калгасаў зусім ня прымаюць удзелу ў лесавывазцы. Так, калгасы «Перамога» і «Чырвоны шлях», Карытнянскага сельсавету, «Расьсьвет» і «Перамога», Заносканага сельсавету, адмовіліся заключыць з лесапрамгасам дагавары на лесавывазку. Прыўленьні калгасаў імя КІМ, «Новая зорка» і «Камунар» хаця дагавары фармальна заключылі, але-ж іх не выконваюць. Дрэнна тое працу і па ашчадкасах сэктары. З патрэбных 325 ашчадкасобных фурманак па Бярэзінскім лесапункту штодзённа выходзіла толькі 253 фурманкі.

Траўцэўскі.

Тураўскі лесапрамгас ўперадзе

ТУРАВА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

У ВЫНІКУ ШЫРОКА-РАЗГОРНУТАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ ВАКОЛ ЛЕСАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ СЯРОД КАЛГАСНЫХ І БЯДНЯЦКА-СЯРЭДНЯЦКІХ МАС, ТУРАЎСКІ ЛЕСПРАМГАС, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РАЎНПАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ НА ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ ДАБІЎСЯ БЛЮКУЧЫХ ПЕРАМОГ.

КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ВЫВАЗЦЫ БУДМАТАР'ЯЛАЎ НА 1-ГА САКАВІКА ВЫКАНАНА НА 101,6 ПРОЦ., ЭКСПАРТНАГА МАТАР'ЯЛУ — НА 100 ПРОЦ., ДРОЎ—НА 112 ПРОЦ. РАЗГОРТВАЕМ РАБОТУ ПА ВЫКАНАНЬНІ ОУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ.

Дырэктар лесапрамгасу ФРЫДМАН.
Сакратар партыйнага райлесапрамгасу ШУСТЭРМАН.
Ст. шыня райлесапрамгасу БАРУХІН

Японцы ліхаманкава рыхтуюцца да новага наступленьня

Акупанты шлюць на фронт новыя часьці

На шанхайскім фронце ідзе ліхаманкавая падрыхтоўка да новых баёў. Прымаўшыя ўдзел у баёх японскія войскі адківаюцца ў тыл і на іх месца выстаўляюцца сьвежыя. Паводле свае каарэспандэнта, кітайцы таксама атрымалі значныя падмацаваньні.

Новы японскі ультыматум

БЭРЛІН, 9. Паводле паведамленьня шанхайскага карэспандэнта «Фосішэ цайтунг», камандуючы японскімі войскамі ў Шанхаі перадаў кітайскаму камандаванню новы ультыматум, у якім патрабуе адступленьня кітайскіх войск яшчэ на 5 міль, г. зн., усяго на 30 міль ад Шанхаю. У выпадку адмаўленьня выканаць гэта патрабаваньне, японскія войскі, як яны кажуць 50 чал., адкінуць варожыя дзеяньні (ТАСС).

Замест Манчжурыі—у Токіё

Аб ролі Лігі нацый, як арганізатара нападу Кітаю, арганізатара паходу імпэрыялістаў супроць кітайскіх саветаў, савецкай прэсай пісалася ужо ня мала. Пад крылышкам Лігі адбываецца зараз адкрыты гандаль кітайскім народам.

Уся панафіцкая балбатня ў Жэневе мае адну мэту — усыпіць пільнасьць працоўных мас ва ўсім сьвеце, адцягнуць іх увагу ад падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні. Для большай маскіроўкі сваёй «работы» па падрыхтоўцы новай імпэрыялістычнай бойні, Ліга нацый для вывучэньня становішча на «месцы» выслала нават спэцыяльную камісію і пасла ў Манчжурыю.

Як-жа «працуе» гэта камісія на месцы? Як падае прэса фашыстскай Польшчы ад 8-га сакавіка, камісія, якая выехала для высьвятленьня становішча ў Манчжурыі, апынулася не ў Манчжурыі, а ў... Тэнцзіне. Тут яна безадкладна прыступіла да «працы». Перш за ўсё зьвярнулася да японскага імпэратара, які запрасіў яе на ўрачысты абед. Вечарам таго-ж дня камісія была на ўрачыстым прыёме, наладжаным таварыствам Лігі нацый Старшыня гэтага таварыства граф Іншы сказаў прамову, у якой падкрэсьліў, якія прававоды Японія мела на працягу апошняга году з боку Кітая. Ці выедзе камісія ў Манчжурыю невядома.

Гэты факт «работы» камісіі лігі, як і самой Лігі нацый лішні раз падцьвярджае, што праграма імпэрыялістычных драпежнікаў, як у Жэневе, так і ў Манчжурыі, Шанхаі—адна—пакзел Кітаю, зьнішчэньне кітайскіх саветаў, падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць СССР.

Кітайскае насельніцтва ня хоча варочацца ў акупаваныя раёны

ШАНХАЙ. 9. На розных участках фронту адбываюцца сутычкі вывадковага характару, але наогул на пазыцыі без перамен. Камандуючы японскімі ўзброенымі сіламі генэрал Сіракава арабіў камандаваньню кітайскай армії прапанову ўстанавіць дэмаркацыйную лінію, за межы якой будзе забаронен пераход кітайскіх войск. Гэта лінія павінна праходзіць ад вёскі Лобангао (на поўнач ад Люхэ), праз Фочжаочэн, Іовонцзы, Вайдзянтэн, Ацдэін, Вейтогчэн да мектэ міжнароднага сэтльмэнту, уздоўж берагоў Сучкоу.

Эвакуаваныя раней служачыя паўднёвага вакзалу вярнуліся ў Наньдао і прыступілі да работы; сотні сялян, што засталіся без прытулку і ўцякілі з Наньдао, не варочаюцца назад, а ўходзяць на поўдзень. Сярод насельніцтва Нанкіну панае вялікі непакой. Пачалася эвакуацыя жыхароў, Параходы адыходзяць перапоўненымі. (ТАСС).

Ангельскі журналіст заклікае да падзелу Кітаю

ШАНХАЙ, 8. Ангельскі журналіст Вудхэд указвае, што ў той час, як японцы дамагаюцца поўнага вырашэньня шанхайскай праблемы, кітайцы з дамогай Амэрыкі хочуць захаваць «статус-кво», прычым гэта палітыка сустрэне, відавочна, значнае падтрыманьне з боку іншых колаў.

Вудхэд выказвае думку, што японцы ніколі не згадзяцца на аднаўленьне «статус-кво», які-б націск на іх не аказвала Ліга нацый у гэтым пытаньні, і што чужаземцы, што знаходзяцца ў Шанхаі, будуць падтрымліваць японцаў. Настаў, чэс, — указвае Вудхэд, — калі ёсьць магчымасьць канчаткова вырашыць мноства спрэчных пытаньняў, якія выклікаюць спрэчкі паміж кітайцамі і чужаземцамі. Было-б грубай памылкай упусьціць гэты спрыяючы момэнт і паспрабаваць вярнуцца да таго нездавальняючага становішча, якое раней існавала. Неабходна адкрыта прызнаць, — кажа далей Вудхэд, — што пакуль Кітай ня ў стане стварыць адказны ўрад, да тых пор абарона Шанхайскага раёну павінна быць укладзена на замежныя дзяржавы.

Далей Вудхэд заклікае чужаземцаў пачаць рух супроць прапаноў аб аднаўленьні «статус-кво».

Матар'яльныя страты кітайцаў у Шанхаі

БЭРЛІН, 9. «Берлінэр Бэрзэн-Кур'ер» паведамляе, што кітайскія ўлады ацэньваюць страты, нанесеныя ў часе ваенных дзеяньняў у ваколіцах Шанхаю, у 20 млн. фунтаў стэрлінгаў. Паводле даных нанкінскіх улад, звыш 700 тыс. кітайцаў вымушаны былі, у рэзультаце наступленьня японцаў, пакінуць зону ваенных дзеяньняў, а 1 млн. рабочых з сем'ямі пазбавіліся работы.

Загадзя ўскладаецца адказнасьць на кітайскія войскі

ТОКІЁ, 9. Агэнцыва Сімбун Рэнга паведамляе з Шанхаю, што Сіракава (камандуючы японскімі ўзброенымі сіламі ў Шанхайскім раёне) апублікаваў дэкларацыю, у якой кітайскія ўлады абвінавачваюцца ў «падрыхтоўцы ваенных дзеяньняў шляхам пабудовы ўкрэпляльняў і пераходзяць нападальняў у раён Гунцзяо». Сіракава пагражае, што «найменшая спроба з боку кітайскага камандаваньня заняць японскія лініі абарыяце да вялікіх сутычак. На кітайскія войскі загадзя ўскладаецца адказнасьць».

Прапанова трымаць судны ў гатоўнасьці

СТАМБУЛ, 4. Згодна паведамленьня індыйскай нацыяналістычнай газэты «Індустан Таймс», урад Індыі распачаў адной з буйнейшых пароходных кампаній Індыі трымаць свае суды ў гатоўнасьці для неадкладнай адпраўкі брытанскіх войск з Бамбэю ў Кітай.

„ЗАКЛІКАЮ РАЗАРВАЦЬ ПЯТЛЮ"

Кліч Рамэн Раляна

ПАРЫЖ. «Юманітэ» апублікавала выступны заклік Рамэн Раляна:

«У імя Кітаю, які пакідае ахвяру, у імя СССР, якому пагражае нападзьніка, у імя народаў усяго сьвету, у імя вялікай чалавечай надзеі, якая выклікаецца і падтрымліваецца ў вас пробудженым народаў прыгнечанай Азіі і гераічным барацьбітам пралетарскай Расіі, кідаю кліч:

«Ня дапамогу, трымай забойцаў».

Я выкрываю перад тварам усяго сьвету агідную хлусьню ўрэнгаў Эўропы і Амэрыкі і ў першую чаргу Францыі, тэй вучні авантурыстаў на службе ў капіталічнай узбраеньняў, якія на ўсёй зямлі прадпрымаюць свае грамадзянскія рукі і карыстаюцца японскім імпэрыялізмам, як сакерай каб, каб рубаць галовы рэвалюцыі.

Я выкрываю спрадвіцтва тэй інтэлігенцыі, якая некалі была вартавым на посе карабля і цяпер яго ў буру, але якая пакінула сабе спакой і прытулашасьць ганебнай цаной свайго маўчаньня, свайёй лёкайскай мысьлінасьцю і служыць інтарэсам і помпнасьці гаспадароў солата і «поетэй».

Я выкрываю жанчынаў пірмаш, пацыфіцтва Лігі нацый.

Я зварачаюся да громлічай сьвядомасьці лепшых сін Эўропы і Амэрыкі. Я заклікаю пацьвярджэньня ціпчэ сябе калёсальныя сілы народаў усяго сьвету разарваць пятлю, якую плутакратычны і ваенны фашызм выбраецца заўтра дакінуць для таго, каб сабіць у зародку рэвалюцыю. Я заклікаю гэтыя сілы замацаваць саюз рабочых мас усіх вызваленых народаў».

„Камэдыя" абвяшчэньня Пу-І рэгентам Манчжурыі

ЧАНЬЧУНЬ, 8. Сёньня ў тры гадзіны дня з Такацзіну (каля Мукдэну) у Чаньчунь экстраным цягнікам прыбыў Пу-І. На вакзале Пу-І сустракалі генэралы, японскія і кітайскія, у тым ліку генэрал Ма і інш. Чжан Цзін-туй, Сі-ся і іншыя выехалі ў Такацзіну, адкуль і суправаджалі Пу-І да Чаньчуня. Паравоз і вагоны цягніка, у якім ехаў Пу-І быў упрыгожаны японскім сьцягам і сьцягам новай Манчжурскай дзяржавы (Манчжоўго). Побудаваны з прычыны прыезду Пу-І трыўмфальныя вароты таксама былі упрыгожаны японскім сьцягам і сьцягам Манчжоўго.

Каля ста старых кітайцаў, тыповых представіцеляў мандарынату, дзэнтры і кітайскіх феадалаў, віталі свайго новага гіраўніка, прычым усе яны былі апранутыя ў нацыянальную манчжурскую вопратку. Аўтамабіль Пу-І і яго жонкі суправаджаўся вялікай колькасьцю аўтамабіляў японскай жандарэрыі і паліцыі. З пекальных сцэн салдат, уключаючы споды і «телохранителей» Пу-І была складзена гаваровая варта. Магазыны, банкі, аўтамабілі, экіпажы і т. д. упрыгожаны сьцягамі новай Манчжурскай дзяржавы, пераважна разнымі японскай паліцыяй. (ТАСС).

Урачыстасьць... бяз кітайскага насельніцтва

ЧАНЬЧУНЬ, 8. У 3 гадзіны дня Пу-І афіцыяльна прыняў пост рэгента (або зарэгіраванага кіраўніка Манчжурскай дзяржавы). Уся цэрэмонія праходзілася каля 10 мінут. На цэрэмоніі прысутнічалі члены Паўночна-Ўсходняга выканкому, некалькі манчольскіх князёў і некалькіх цывільных кітайцаў і ваенных афіцыяльных асоб, якія представілі «увесь народ чатырох паўночна-ўсходніх правінцый». Сярод прысутных чужаземцаў знаходзіліся представіцелі японскіх ваенных і грамадзянскіх уладаў, чужаземных карэспандэнты, представіцелі ад беларускадзейцаў.

Вонкавая абстаноўка цэрэмоніі нагадвала часы кітайскай манархіі. Пу-І сядзеў на ўзвышэньні, пакрытым тварам на поўдзень, усе прысутныя сядзелі тварам на поўнач. Адозва Пу-І была надрукавана на жоўтай імпэратарскай шалкоўцы. У часе сядзеньня Пу-І адвешваў імпэратарскія паклоны. Усіх прысутных было каля 300 чалавек, з іх каля 200 чал. японцаў. Уся прыезда Пу-І была вытрымана ў старым імпэратарскім стыле.

Пасьля цэрэмоніі быў узьняты сьцяг Манчжоўго (Манчжурскай дзяржавы).

Сьвяшчная цэрэмонія прайшла таксама бледна, як і ўчарайшая. Кітайскае насельніцтва адносілася зусім пасыўна і раўнадушна да гэтых «урачыстасьцяй», ня прымочы ў іх ніякага ўдзелу.

Маніфэст ангельскіх вучоных і грамадзкіх дзеячаў

ЛЕНДАН, 8. Рад выдатных ангельскіх вучоных, грамадзкіх дзеячаў і дзеячаў мастацтва апублікавалі маніфэст, у якім заклікаюць ангельскі ўрад поўнасьцю падтрымаць прапанаваны СССР праект раззбраеньня.

У яму падпісаўных маніфэст пісьменьнікі: Лаўрэнс, Хаўсман, Нувінсон, Уігфрыд Сасун, мастакі: Імайт, Лёў, прафэсар, Фрэдрык Іцсолі, Бэртран Рэсэль, лёрд Понсанбі і інш.

ФРОНТ ЗАБАСТОВАЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ПАШЫРАЕЦЦА

Бастуючыя гарняжы сустрэлі паліцыю градам каменьняў

ВАРШАВА, 9. Забастоўка гарнякоў у Дамброўскім і Кракаўскім басэйнах пратягваецца. На дзелегацкім сходзе, які адбыўся ўчора, пастаноўлена забастоўку ня спыняць. На капальні «Віктар» адбылася масоўка, на якой рабочыя выказалі недавер'е сваім дэлегатам за недапушчальную тактыку. Адбыліся такама масоўкі і на іншых капальнях, пасьля чаго рабочыя накіравалі дэманстрацыю. Беспрацоўныя, якія адзін час прапавалі ў якасьці штрэйкбрэхераў, на капальні «Іонін», «Марс» і «Сатурн» на работу больш не зьявіліся.

Учора ў Дамброўскім басэйне адбылася аднагадзінная дэманстрацыйная забастоўка салідарнасьці рабочых металюргічных заводаў. На праведзеных у радзе прадпрыемстваў масоўках рабочыя пастанавілі адлічыць аднадзенны заработак у фонд дапамогі бастуючым.

У Кракаўскім басэйне на капальні «Зьшпак», якая не ўваходзіць у склад вугольнага канцэрну і на якой 5 гарняжоў ня спынілі работы, учора адбылося масавае выступленьне бастуючых рабочых і іх жонак, якое мела мэтай праганяць штрэйкбрэхераў. Тысячная маса дэманстрантаў была разагнана паліцыяй. У радзе пунктаў Верхняй Сілезіі адбыліся учора сутычкі рабочых і беспрацоўных з паліцыяй.

У Ожэгове беспрацоўныя сабраліся перад будынкам магістрату, пратестуючы супроць затрыманьня і зьніжэньня дапамог. Будынак магістрату быў закідан каменьнямі. Прыбыўшы моцны паліцэйскі атрад кінуўся на дэманстрантаў, пускаючы ў ход зброю. Рабочыя аказалі супраціўленьне. Адзін рабочы сьмяротна паранен. Паранены з паліцэйскія і намэстнік паліцэйскага камісара.

Дэманстрацыі беспрацоўных адбыліся таксама ў Сьвентаславіцах, Ліпінах, Шарпі і Пекарах пад кіраўніцтвам камуністаў. У сувязі з закрыцьцём капальні «Флёрэнтына» у Лагеўніках (Верхняя Сілезія) і масавым звальненьнем рабочых, учора на гэтай капальні была абвешчана аднадзенная забастоўка пратэсту. Баставала 1.400 рабочых. (ТАСС).

Камуністычны плякат на трамвайных праводах

ВАРШАВА, 8. Учора ўвечары ў Варшаве на раду вуліц Дзельнай і Замегофа быў прывешан да трамвайных праводаў камуністычны плякат з двума палаючымі факеламі ў памяць забітага паліцыяй на дэманстрацыі 5 сакавіка рабочага Саміка. Плякат, каля якога сабраўся вялікі натоўп народу, вісеў больш гадзіны, пасьля чаго быў зьняты падасьпеўшай на трэцяй ку паліцыяй. Пахаваньне Саміка адбудзецца сёньня ночу.

Масавыя аблавы і арышты ў Сандамірскім і Апатаўскім паветах

ВАРШАВА, 8. «Ілюстраваны Кур'ер цодзенны» паведамляе аб масавых аблавах, зробленых у Сандамірскім і Апатоўскім паветах. Арыштавана больш 60 чалавек па падазрэньні ў камуністычнай дзейнасьці. Масавыя вобыскі і арышты зроблены паліцыяй таксама і ў Іншаўраславе (Пазнанскае ваяводзтва). Па абвінавачэньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці арыштавана 5 чалавек. (ТАСС).

АПОШНІЯ ВЕСТКІ З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

НА РАШАЮЧЫХ ВУЧАСТКАХ

ВУГАЛЬ. 7-га сакавіка па Саюзе здабыта 187.093 тоны вугалю.

8-га сакавіка па Донбасе здабыта 130.403 тоны вугалю.

МЭТАЛЬ. 6 сакавіка на ўсіх мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 14.246 тон чыгуну.

Будматар'ялы

Лесапільнае. За першую пяцідзеўку сакавіка Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат выканаў сваю вытворчую праграму па лесазаводзе № 6 на 100,2 проц.—расьпілавалі 1.114,1 кбм. сырцу; па лесазаводзе № 7 на 79,9 проц. — расьпілавана 623,7 кбм.; па па лесацэху — на 82,9 проц. — расьпілавана 3.114,5 кбм. сырцу; па беладрэўным цэху — на 96,4 проц. — выпушчана прадукцыі 9.241 кв. мэтраў; па фанэрным цэху — на 103,3 проц. — выпушчана 524,3 кбм. фанэры.

Цэх стандартных дамоў за гэты час выпусьціў 14,27 стандартных дамы, што складае 101,9 проц. пяцідзеннага заданьня.

* * *

5 сакавіка камбінат «Камінтэрн» (Нова-Барысаў) выканаў сваю вытворчую праграму па лесапільным на 82,95 проц. — расьпілена 159.25 кбм. сырцу і па фанэры на 85,3 проц. — выпушчана 42,11 кбм. фанэры. 6 сакавіка камбінат выходны, 7-га—праграма па лесапільным выканана на 96,6 проц. — расьпілена 176,5 кбм. сырцу і па фанэры — на 91,5 проц. — выпушчана 45,16 кбм. фанэры.

* * *

4 сакавіка гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат выканаў вытворчую праграму па лесапільным — па лесазаводзе «Калпраца» — на 102,6 проц. — расьпілавана 385 кбм. сырцу і на лесазаводзе «Сацыялізм» — на 93,3 проц. — расьпілена 370 кбм.

5 сакавіка вытворчая праграма па лесазаводзе «Калпраца» выканана на 103,74 проц. — расьпілена 389 кбм.; па лесазаводзе «Сацыялізм» — на 91,53 проц. — расьпілена 363 кбм.

* * *

4 сакавіка лесапільны завод імя Халтурына выканаў сваё заданьне па лесапільным на 112,42 проц. — расьпілена 202,362 кбм. сырцу.

* * *

ЦЬВІКІ. 6 сакавіка дрота-цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» вырабіў 6.040 кгр. будаўнічых цьвікоў, што складае 91,5 проц. пляну.

Угнаеньні

За першую пяцідзеўку сакавіка Крычаўскі фасфарытны завод размалоў 181 тону фасфарытнай мукі, што складае 38,9 проц. заданьня.

Папера

5 сакавіка шклоўскай папяровай фабрыкай «Спартак» выпушчана 14,3 тоны паперы, што складае 53,18 проц. заданьня.

6 сакавіка фабрыкай выпушчана 15,6 тон паперы, або 58,58 проц. пляну.

* * *

5 сакавіка на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» (Чашнікі) з-за недахвату торфу працавала толькі адна самачарпалка, якая выпусьціла 12.206 кгр. паперы, або 92,4 проц. заданьня.

Скура

За першую пяцідзеўку сакавіка гарбарня «Бальшавік» выпусьціла прадукцыі на 166.810 руб., што складае 116,53 проц. заданьня. Першы хромавы цэх даў прадукцыі на 81.319 —128,08 проц. пляну; другі хромавы —на 72.254 руб. — 114,01 проц. заданьня.

* * *

За гэту-ж пяцідзеўку віцебская гарбарня выпусьціла прадукцыі на 91.975 руб., што складае 101,6 проц. пляну. У тым ліку чырвонадубны цэх даў прадукцыі на 33.293 руб. — 117,5 проц. заданьня, штампавальны цэх — на 58.682 руб. — 95,8 проц.

Абутак

4 сакавіка віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта выпусьціла 3.060 пар абутку, што складае 92,4 проц. пляну. 5 сакавіка фабрыкай выпушчана 3.510 пар, або 106 проц. заданьня. 6 сакавіка — 3.040 пар, або 91,9 проц.

* * *

4 сакавіка гомельская абутковая фабрыка «Праца» выпусьціла 2.955 пар абутку, або 98,5 проц. пляну, у тым ліку праграма па шыцьці ботаў выканана на 172,2 проц. — выпушчана 1.722 пары, па мужчынскім абутку на 63,2 проц. — 632 пары.

5 сакавіка фабрыкай выпушчана 3.480 пар, што складае 116 проц. заданьня, у тым ліку праграма па шыцьці ботаў выканана на 195,5 проц. — выпушчана 1.955 пар; па мужчынскім абутку — 30,1 проц. — 301 пара і па дзіцячым абутку — на 95,4 проц. — 477 пар. Абутку для падросткаў выпушчана 747 пар, або 149,4 проц.

ШВЭЙНЫЯ ВЫРАБЫ

За першую пяцідзеўку сакавіка віцебская швэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» выканала сваю вытворчую праграму на 87,2 проц.

За гэты-ж час фабрыка «Прафінтэрн» выканала плян на 98,2 проц.

З 1 па 6 сакавіка швэйная фабрыка «Кастрычнік» выпусьціла 13.099 штук пальто, што складае 102,8 проц. заданьня.

7 сакавіка фабрыка выпусьціла 3.593 пальто, або 113,8 проц. дзеннага заданьня.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— Сьпіс дакладчыкаў, выпучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня дакладаў аб дні Парыскай Камуны: Засцепкер (Камвуз) — зав. імя Варапылава; Горын (БАН) — зав. «Казуцар», Страгоўскі (БКС) — зав. «Бальшавік», Верба (ЦКК) — зав. імя Молатава, Агульнік (Камвуз) — ф-ка «Камунарка», Джалюк («Зьвязда») — зав. «Ударнік», Мар'ясін (НКЮ) — Шкловавод, Гершман (ЦКК) — абутковая, Гольцштэйн (ВОНГ) — хлебазавод, Казашлін (саўбуд) — пічотчная, Дунец («Акцябр») — «Кастрычнік», Шпітко (гар. пракуратура) — друк. імя Сталіна, Шыфрын (НКЮ) — мясакамбінат, Шапіра («Раб. і калг. Бел.») — «Беларусь», Тартакоўская (Камвуз) — Хэмфармзавод, Каюючыц (хэмінстытут) — сьпіртазавод, Зайчык (НКАЗ) — «Чырв. хэгік», Ошараў (НКА) — Эльвод, Каган (Камвуз) — зав. «Пралетары», Рудзінскі (Саўбуд) — «Чырв. зорка», Трус (ін-т гіст. парт.) — ф-ка «Беларуская», Гурэіч Ц. (ін-т гіст. парт.)—«Чырв. тэкстыльшчык», Кучынскі (Камвуз) — шчапінная, Міхайлаў («Калт. Белар.»)—скарняжная ф-ка, Астраноўскі (ЦК) — шпалерная ф-ка, Слонім (ін-т прамысл.) — ф-ка імя 8 сакавіка, Галаскоп (Камунбанк) — ф-ка рымароў, Раманчук (ЦК) — ф-ка імя Крупскай, Календа (ДВБ) — лямцавая ф-ка, Фрыдман (СНК) — Вадаправодз, Кейлін (Дзяржбанк) — гарчавікі, Каган (ЦК) — Уціль, Бойнаў («Зьвязда») — БСІКА, Пацальніцкі (ін-т гіст. парт.) — Белсамтрамсэрвіс, Сьвірыдаў (ЦК) — ЦЭЦ, Дубавіцкі (СНК) — нагельні, Гарын («Зьвязда») — сл. цагі, Ярыгін (ЦКК) — «Полымя рэвалюцыі», Берзін (Бел. бюро ЦК чыг.) — сл. руху, Радзецкі (Камвуз) — сл. шляху, Цудзін (ЦК МОПР'у)—электрасувязь, Лодысеў (СНК) — Сакэтрансе, Альперовіч (Дзяржплан) — транспартны трэст, Галамшток (ЦВК) — Белдзяржбуд, Канакоцін (ЦК) — Мешбуд, Лабадаеў (ЦК) — Белжылсаюз, Некрашэвіч (ДВБ) — Гаржылсаюз, Бар («Акцябр») — Дом Ураду, Улазаў (ЦК) — абутк. майст. Рэзэрвовымі дакладчыкамі вылучаюцца: Хаскін, Калмык, Ваноўоўі, Сэрбента, Файнбург, Гурэскі — НКА, Курцік, Саевіч, Белашэўскі, Аверын. Консультацыі адбудзецца 15 сакавіка, у 7 гадз. веч., у памяшканьні Дому Камасэкзэты, пакой нумар 6. Кансультацыі праводзяць т. т. Засцепкер і Цудзін. Усім сакратаром калектываў і ячк. КП(б)Б даганяцца з вылучанымі дакладчыкамі. Савецкія ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў самастойна.

— 11-III, у 7 гадз. веч., у Доме Камасэкзэты (пакой нумар 6) — сэмінары для вайсковых прапагандыстаў.

— 13 сакавіка, у 6 гадз. веч., у памяшканьні інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б (на дварэ, на 2-м паверсе) склікаецца арганізацыйнае пасяджэньне сэкцыі гісторыкаў партыі т-ва гісторыкаў-марксыстаў Беларусі. Запрашаюцца ўсе выкладчыкі гісторыі партыі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, а таксама аспірантуры інстытуту гісторыі партыі.

— 11 сакавіка, у 7 гадз. веч., у памяшканьні гаркому КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне аб'яднага бюро скаргаў з разглядам паступных спраў: 1) Выніхі праверкі абору пошлеу на г. Менску. 2) Справа аб вышэйчэньні сакаў г. Менску. Выклікаюцца: прадстаўнікі НКЗ, КГЦ, райкалгасаюзу, Гарзавету, Саўгасцэнтру, заг. дамамі ўсіх жаетваў, ад трэсту грам. харч. усе заг. сталовых г. Менску, ад Гаржылсаюзу, Галоўміліцыі, сацыва-гарадзк. трэсту, Пітуплатрэсту, Белсельгасбанку, ад Сьвіназаводу, БКС, мед.-прад. трэсту, Сьвіназаводтрэсту, БЖС, Гаркамгасу, ГСНС і ўсе старшыні ЖАКТ'аў. Выклікаюцца рабочыя засядацелі заз. «ДА», друк. імя Сталіна, шклозаводу «Пралетары», шпалерная фабрыка. Запрашаецца актыў і «ЛК».

— Менгарком, ЦКК РСІ і фр. Гаржылсаюзу склікаюць 11 сакавіка, у 7 гадз. веч., у памяшк. Менгаркому (вул. Энгельса, заля пасяджэньняў, 3-ці паверх) усіх старшыняў ЖАКТ'аў, заг. дамамі і культпрапаўнікоў. З прычыны важнасьці пытаньняў, яўка абавязкова.

— 11 сакавіка, у 6 г. веч., у памяшк. клюбу «КІМ» склікаецца нарада агітмасав. аддзелаў і жансэктараў ПК і РК КП(б)Б з наступным парадкам дня: 1) Аб перабудове агітмасавай работы ў новых умовах. 2) Даклады 3-х партклетэктываў буйнейшых прадпрыемстваў (Гомасельмаш, зав. «Бальшавік» — Менск, ф-ка «Дзьвіна» — Віцебск) аб барацьбе партарганізацыі за прафінпляны. 3) Даклады: ільнаводчага калгасу, жывёлагадоўчага саўгасу, МТС і аднаго раёну аб разгортваньні работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Акрамя гэтага, у адпаведнасьці са спэцыялізацыяй раёнаў, будуць разгледжаны ў сэкцыях (жэнработнікаў) наступныя пытаньні: 1) прамысловая сэкцыя — задачы масавай работы ў цэху, брыгадзе. 2) Жывёлагадоўчая сэкцыя — праграма соц. жывёлагадоўлі на 1932 г. (заснаваньне маладняка, праваедзеньне злучкай і аларостнай кампаніяй, павышэньне ўдою малочнага стада). 3) Ільнавотчая сэкцыя — удзел працоўных жанчын у пасеве, узьнімці ўрагайнасьці і апрацоўцы тэхкультур. 4) Аб арганізацыі выхадаў на работу жанчын-калгасьніц.

— Культпрэс Гаркому КП(б)Б і т-ва марксыстаў-дзяржаўнікаў 11 сакавіка, у 10 гадз., у залі гаркому склікаюць нараду па пытаньні арганізацыі ячэек т-ва марксыстаў-дзяржаўнікаў на прадпрыемствах і ў апаратах савецкіх установах. На нараде павінны прысутнічаць усе таварышы, вылучаныя яч. КП(б)Б для арганізацыі ячэек т-ва МД: зав. імя Варапылава, «Бальшавік», ф-ка «Кастрычнік», зав. «Камунар», зав. «Полымя рэвалюцыі», зав. «ДА» імя Молатава, друк. імя Сталіна, абутковая ф-ка, ф-ка імя 8 сакавіка, і галоўнейшых устаноў: СНК, ЦКК-НК РСІ, Гарсавет, АДПУ, Камвуз, ін-т Саўбуду і права, ЦВК, БАН, НКЮ і НК кам. гаспадаркі. На нараду выклікаюцца аграэкз таго, т. т. Капаслін, Масевіч, Рэйзінскі, Гершольман, Жукаў, Сьпефаноўіч (НК РСІ), Рагаў, Бакаеў, Даяменгчанка (Камвуз), Фрыдман (СНК), Годэр, Лушчыкін, Юрэвіч, Эстрына, Бабінскі, Яфэль, Шэйбра (НКЮ), Хілевскай (ЦВК), Ягаўдзік (ЦКК), Галандза і Гоцман (ін-т сав. буд.).

15 САКАВІКА, У г. МЕНСКУ АДКРЫВАЕЦЦА

VII УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1) Даклад УсеЦСПС.
2) Справаздача ЦСПСБ (тов. тав. Рыжоў).
3) Справаздача рэв. камісіі (дакл. тав. Горелад).
4) Прамфінплян прамысловасьці на 1932 г. і вынікі работы за студзень—люты м-цы (дакладчыкі: ВСНГ—Грыцавіч, НКСнаб—Балцін, Вецлесправ—Міленый і ад ЦСПСБ—Каменштейн).
5) Аб рабочым забясьпячэньні і самадзейным гандлі (дакладчыкі: НКСнаб—Розін, БКС—Хаськін).
6) Даклад НКПрацы і суміжнай Рэсп. Камітэту кас сацстраху (дакладчыкі: НКПрацы—Басьнін і РКС—Салаўёў).
7) Выбары пленуму ЦСПСБ, рэв. камісіі, Рэсп. камітэту кас сацстраху і дэлегатаў на IX-ты ўсесаюзны зьезд прафсаюзаў.

Выдача мандатаў праводзіцца, пачынаючы з 12-III з 9 да 4 гадз. дня і з 6—10 гадз. веч., у памяшканьні кіраўніцтва справамі ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх. 13 пакой).]

Мандатная камісія.

13-га сакавіка 1932 году, у 6 гадз. вечара ў памяшканьні ЦСПСБ

АДКРЫВАЕЦЦА

пашыранае пасяджэньне цэнтральнага штабу па кіраўніцтве ўсебеларускім сталінскім паходам фабрычна-заводзкага друку

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Даклады лепшых фабрычна-заводзкіх шматтыражак і штодзенак, вызначаных гарадзкімі штабамі ў якасьці кандыдатаў на атрыманьне права на рапарт 7-му ўсебеларускаму зьезду прафсаюзаў.

2. Вызначэньне 5-ці лепшых фабрычна-заводзкіх газэт БССР для атрыманьня далегацкіх месц (з дарадчым голасам) на VII-мы ўсебеларускі зьезд прафсаюзаў.

Гарадзкія штабы па кіраўніцтве сталінскім паходам Менску, Гомелю, Віцебску павінны вылучыць для дакладу па 3 лепшых фабрычна-заводзкіх газэт (з якіх па адной штодзенкі), Рэчыцы і Жлобіну—па 1 газэце.

Дакладчыкі-рэдактары фабрычна-заводзкіх газэт павінны абавязкова прывезьці ў пісьмовай форме разгорнутыя даклады аб сваёй рабоце за 1-шы квартал 1932 году, а таксама комплекты газэт за гэты час.

Выдатні па працэсьце рэдактараў фабрычна-заводзкіх газэт аплачваюцца ў Менску.

Рэгістрацыя прыехаўшых—у радзецкі „Рабселькор".

Центральны штаб па кіраўніцтве ўсебеларускім сталінскім паходам фабрычна-заводзкага друку.

кіно „Інтэрнацыянал"

СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА

РЫЧАРД ТОЛМЭДЖ

У ЗАМЕЖНАЙ КАМЭДЫІ

САКРЭТ ХАРАСТВА

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:

КІНО-ХРОНІКА СЮЖЭТНА

НАШ УЛЬТЫМАТУМ

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 гад. дня	Выключны замежны фільм ПАРЫЖАНКА драма ў 8 частках.
ПРАЛЕТАРЫ Каса-ад 12 г. дня	МОНШ БЭНКС у замежн. фільме Хачу быць рэпарцёрам
СПАРТАК	БРАНЯНОСЕЦ ПАЦЕМКІН ЗВЫШ ПРАГРАМЫ БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ у 2 частках

У мэтах увядзеньня адм.-гаспадарчых выдаткаў 1932 г. у рамкі зацьверджаных кашторысаў і залажэньня штатнай дысцыпліны

НК-РСІ БССР з 15-III-г. г. уводзіць

ПАНАРОДНЫ КАНТРОЛЬ ЗА ВЫПЛАТАЙ ЗАРПЛАТЫ

па ўсіх установах і арганізацыях, якія знаходзяцца на дзяржбюджэце і ў г. Менску.

Пачынаючы з 15-3-г. г. усе асыгнаўкі-чэкі на зарплату вышэйпаказаным установам пр-дстаўляць у фінгрупу НКРСІ Бел. (другі паверх, пакой № 2, тел. 11-75) для праверкі, прычым да асыгнова-чэкаў прыкладасьці:

а) патрабавальныя ведамасьці на выплату зарплаты;
б) штатнае расьпісаньне, зацьверджанае НКРСІ Бел.;
в) пастанову НКПрацы аб стаўках даных установы.

Папярэджваецца, што без візы фінгрупы НКРСІ Беларусі асыгнаўкі-чэкі Дзяржбанкам на будуць аплачвацца.

Фінгрупа ЦКК-НКРСІ БССР.

КНІГУ НА ДАПАМОГУ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЕ

Цэнтральны магазын „ОГИЗ'а РСФСР"

(Савецкая. 71, тэлефон 8-65

ПРАВОДЗІЦЬ З УДЗЕЛАМ КАНСУЛЬТАНТАЎ

ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІК

забясьпячэньня арганіз. і індыв. спажыўца пасеўнай і спец. літаратурай.

Там-жа праводзіцца кампантаванньне бібліятэк па розных пытаньнях.

З 10 па 20 сакавіка магазын адкрыт бесьперапынна з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. вечі.

Бесплатнае „ОГИЗ'а Р. ФСР".

СЭКТАР ПРАМКАДРАЎ ВСНГ БССР

паведамляе, што

1-я ўсебеларуская канфэрэнцыя школ ФЗВ

адкрываецца сёньня, 11 сакавіка, у клюбе мэталістаў, у 6 гадзін вечара.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Становішча і задачы падрыхтоўкі кадраў у сувязі з разьвіцьцём прамысловасьці.
2) Арганізацыя вытворчага і тэарэтычнага навучаньня.
3) Арганізацыя грамадзка-палітычнага выхаваньня.

Сэктар прамкадраў ВСНГ БССР.

Жонка і сваякі з глыбокім жалем паведамляюць аб сьмерці

УЛАДЗІМЕРА ІВАНАВІЧА ГРЫНКЕВІЧА

Вынас цела з тубыспансэра 11-III-32 г. у 4 г. дня.

СЭКТАР КАДРАЎ БЕЛПТУШКА-КРОЛІКАВОД ЧАГА ТРЭСТУ

абвяшчае прыём студэнтаў

на 1-